РАДЫЁ у гадз. ночы:

ПАРЫЖ, 8 У Лянсэ—цэнтры паўночнага вугольнага раёну—адкрыўся зьезд унітарнага прафсаюзу гарнякоў, на якім прысутнічае 70 дэлегатаў ад усіх вугальных раёнаў Францыі. Зьезд сустрэў бурнымі авацыямі ліст гарняка Торэса (члена палітбюро кампартыі), які заклікаў зьезд стойка трымацца лініі Прафінтэрну.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 231 (3339) Серада 9 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

Урадовая бібліятэка г. Горлага
Инв. 2039

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

Безгаспадарчасьць і растраты ў Магілеўскім камунальным трэсьце

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Акруговы суд распачаў разгляд справы магілеўскага камунальнага трасту. Усяго на лаўцы падсудных 12 чал., у тым ліку дырэктар трэсту Жэліхоўсі. Усе падсудныя абвінавачваюцца ў безгаспадарчасьці, дапускаючы яной камунальны трэст за два гады моў 210 тыс. р. дэфіцыту. Рад падсудных абвінавачваецца ў растраце вялікіх сум грошай. Па справе выклікана звыш 20 сьведак. Суд будзе цягнуцца 5 дзён.

Фронт хлебазагатовак—фронт клясавае барацьбы

За першы квартал (ліпень-верасень) яшчэ няма поўных вестак аб хлебазагатоўках, але ўжо можна падагуліць вынікі і зрабіць вывады. За ліпень плян выканан у разьмеры 37,9 проц., за жнівень — 59,8 проц. і за 20 дзён верасьня — 28,8 проц. Гадавы плян выканан у разьмеры 7 проц. Зразумела, першыя два месяцы не вяўляюцца паказальнымі і рашаючымі для хлебазагатовак, але верасень, які даў за 20 дзён толькі 28,8, зьяўляецца вельмі дрэннай адзнакай для наступных месяцаў.

Памольны збор спаганяецца лепш, але ўсё-ж паасобныя акругі непрабачальна адстаюць. Пры выкананьні па БССР гадавога пляну ў сярэднім у 18,1 проц., па **Гомельскай** акрузе маем толькі 11,4, па **Полацкай** — 13 проц., **Бабруйскай** — 14,8. **Тыя-ж акругі ў верасьні ідуць ніжэй ад усіх іншых округ БССР.**

Чым тлумачыцца паяўна нездавальняючае выкананьне пляну хлебазагатовак? У розных акругах тлумачаць па-рознаму. Манаўрамі, адсутнасьцю ветра і немагчымасьцю працаваць ветраком, у выніку чаго, бачыце, было дрэннае паступленьне памольнага збору і г. д. Зразумела, усё гэта нясур'ёзна. Лепш за ўсё гэтыя нацягнутыя тлумачэньні абвяргаюцца жыцьцём. **Там, дзе манэўры былі скарыстаны для хлебазагатовак, у прыватнасьці ў Рагачэве, мы маем лепшыя вынікі па выкананьні пляну хлебазагатовак і ў тых акругах, дзе ёсьць шмат ветракоў — пры выстарчальным спагнаньні з боку мясцовых савецкіх і загатоўчых органаў — спагнаньне памольнага збору ідзе здавальняюча і часта вышэй 100 проц. месячнага заданьня.**

Работа загатоўчых арганізацый праходзіла, ды і зараз праходзіць нездавальняюча. Усе сядзяць на пунктах і чакаюць чырвоных абозаў, забыўшыся зусім аб іспаваньні рынкаў, на якіх арудуюць прыватнікі - спэкулянты. Ажыятаж і бойкі паміж дзяржзагатоўцамі і каапэрацыяй працягваюцца і прымаюць часамі абурачыя формы. На пленуме Бабруйскага акругкому таварышы расказалі пра выпадак перахватваньня чырвонага абозу сельска - гаспадарчай каапэрацыяй ад спажывецкай каапэрацыі, прычым ужываюцца мэтады перахвату, якія не да твару каапэрацыйнай арганізацыі.

Кантрактацыя збожжавых пасеваў прайшла здавальняюча і здавалася-б, што ў гэтым годзе, пры наяўнасьці добрага ўраджаю, здача закантрактаванага збожжа павінна быць праведзена ў тэрміны і поўнасьцю. **Але на справе гэтага няма.** Сельска-гаспадарчая каапэрацыя **ня прымае ніякіх мер да выкананьня кантрактаў** і гэта работа ідзе падзвычайна марудна. **Маем выпадкі продажу хлеба кантрактантамі на прыватным рынку да выкананьня ўмоў кантракту.** Гэта зьява павінна быць зараз-жа спынена, павінны быць узмоцнены меры па спагнаньні закантраванага збожжа, на прыцягненьні да адказнасьці злосных кантрактантаў.

Таксама нездавальняюча выконваюцца заданьні па здачы хлеба калгасамі і саўгасамі, прычым трэба адзначыць, што лішкі былі азначаны ў **паменшанай** колькасьці. Сабатаваньне здачы збожа калгасамі і саўгасамі зьяўляецца недапушчальным злачынствам, якое адмоўна ўплывае на вакольнае сялянства. Гэтыя арганізацыі павінны быць прыкладам і першымі здаць **усе лішкі** дзяржаве. Неабходна зараз-жа прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў калгасаў, якія не здаюць сваячасова лішкі.

На мясцох трэба сачыць таксама за тым, каб ніхто не скарыстоўваў харчовыя культуры для тэхнічных мэт. Усякія падобнага роду спробы павінны зьлічвацца самымі рашучымі мерамі.

Павінна быць зьвернута асаблівая ўвага на атрыманьне ад сялян **харчавых культур** (жыта, пшаніца), прычым, кулацкім пластом павінны быць даны цьвёрдыя заданьні.

У гэтым годзе мы ўпяршыню даводзім плян хлебазагатовак да сяла. З сабраных вестак відаць, што пляны ва ўсіх сёлах прыняты сялянствам з павялічэньнем у некаторых выпадках да 200 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што **асноўная маса сялянства, беднота і серадняк падтрымліваюць мерапрыемствы савецкай улады і камуністычнай партыі ў вёсцы і дэманструюць гэта добраахвотным павялічэньнем пляну хлебазагатовак у сваім сяле.** Супраціўленьне кулака, які не жадае здаваць хлеб дзяржаве, атрымлівае рэзкі адпор дружным выступленьнем серадняцка - бядняцкага блёку.

Але ўсё-ж трэба адзначыць, што ў цэлым радзе месц лінія партыі ў хлебазагатоўках была скажана. Пляны даводзіліся да бядняцкага і серадняцкага двара ў абавязковым парадку. **Вельмі часта кулак і заможны пры такім парадку раскладкі незакраналіся.** Горш за ўсё тое, што да гэтага часу хлебазагатоўкі ідуць за кошт серадняка, **на кулака яшчэ не націснулі.** І вось гэта, далёка невыстарчальная, абавязковая раскладка на кулака, адсутнасьць націсканьня на яго ў мэтах сваячасовай здачы ім хлеба, і побач з гэтым давядзеньне пляну аж да бядняцкага двара, зьяўляецца буйнейшай памылкай, праяўленьнем правага ўхілу на практыцы.

З такім становішчам трэба змагацца шляхам рашучага націску і рэпрэсій па кулацкую верхавіну, якая ня выконвае заданьняў па здачы хлеба дзяржаве, забясьпечыўшы ў гэтым актыўнае падтрыманьне з боку беднаты і серадняку.

Пад'ём і актыўнасьць беднаты і серадняку трэба накіраваць супроць кулака, прыватнага скупшчыка і спэкулянта. Трэба стварыць такую абстаноўку вакол кулака і націснуць на яго, каб ён, не чакаючы рэпрэсыўных мер з боку савецкіх органаў, павёз бы хлеб на дзяржаўны або каапэрацыйны склад.

На мясцох, відавочна, да гэтага часу не разумеюць, што хлебазагатоўкі, асабліва, у бягучым годзе зьяўляюцца тым вучасткам, на якім з усёй вострасьцю разгараецца клясавая барацьба.

Толькі неразуменьнем гэтага важнейшага значэньня хлебазагатовак можна тлумачыць, што так мала на мясцох удзяляецца ўвагі, сіл і сродкаў гэтай рабоце, гэтай барацьбе.

Злачынная бязьдзейнасьць загатоўчых апаратаў на мясцох і нядбайныя адносіны да хлебазагатовак з боку акругкомаў, акрвыканкомаў і іх нізавых зьвеньняў павінна быць безадкадна ліквідавана.

Тэмп пераходу на бесьперапынны рабочы тыдзень невыстарчальны

Што паказала нарада пры Кастрычнікавым РК КП(б)Б па пытаньні бесьперапынкі і адзінаначальніцтва

Кастрычнікавы райком КП(б)Б гэтымі днямі правёў нараду дырэктароў прадпрыемстваў, кіраўнікоў устаноў, старшынь фабкомаў і мясцкомаў, сакратароў ячэек і рэдкалегій насьценгазэт па пытаньні пераходу на бесьперапынны рабочы тыдзень і адзінаначальнасьці ў прамысловасьці.

Пасьля дакладу т. Каркліна па гэтых пытаньнях разгарнуліся жвавыя спрэчкі. Некаторыя таварышы гаварылі аб практыцы работы і больш за ўсё аб тым, як і што трэба зрабіць.

Што-ж паказала гэта нарада?

Перш за ўсё, тое, што да правядзеньня ў жыцьцё пастаноў партыі і ўраду аб бесьперапынным рабочым тыдні яшчэ не прыступілі. У раёне на бесьперапынны тыдзень перайшло 3-4 установы і гатовы да пераходу 1-2 прадпрыемствы. Такі тэмп ажыцьцяўленьня пастаноў партыі — злачынная павольнасьць. І ніхто з удзельнікаў нарады дапушчы гэтай павольнасьці не прадставіў, не даў, хаця на асобных прадпрыемствах, як зазначалі ўдзельнікі нарады, ёсьць труднасьці: адсутнасьць прэсэтаў, забясьпячэньне сырцом, недахват кваліфікаванай рабочай сілы, цяжкасьці ў збыце («Барыкадзі», гута). Але нават і пры гэтым становішчы ніяк нельга апраўдаць гэтай злачынай павольнасьці па радзе іншых прадпрыемстваў і устаноў.

У правядзеньні мерапрыемстваў па пераходзе на бесьперапынны рабочы тыдзень патрэбна рашучасьць, растаропнасьць і напружанасьць энэргіі, бо замаруджаньне ў правядзеньні гэтае работы прытрымлівае той патрэбны тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва, які вызначаны пастановамі партыі. **Пастановы партыі і ўраду аб бесьперапынным тыдні яшчэ ня сталі здабыткам усіх пагалоўна пралетарскіх мас.** Нарада падкрэсьліла, што за растлумачэньне палітычнага значэньня гэтых пастаноў не прыступілі парт'ячэйкі, прафсаюзы, кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў. Адзэтуль вынікаюць часамі такія сказы з боку адсталых рабочых, што «бесьперапынка вядзе да драбленьня рабочае клясы». Зусім зразумела, што клясавы вораг пры правядзеньні любога прадпрыемства партыі і ўраду, а тым больш мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні пяцігодкі, высокіх не лампаў, зробіць усё патрэбнае для зрыву, для затрыманьня бурнага ўзросту ўсяго народнае гаспадаркі. Клясавы вораг і тут скарыстоўвае асобных адсталых рабочых, якія па сутнасьці справы адбіваюць настрої клясавага ворага. І адсутнасьць штодзённай работы па растлумачэньні значэньня гэтай пастановы сярод пралетарскіх мас, ма-ж правядзеньне яе ў жыцьцё,— усё гэта ідзе на карысьць клясаваму ворагу.

Тому ў хутчэйшы тэрмін усе ўстановы і прадпрыемствы павінны выканаць пастановы партыі і ўраду—перайсьці на бесьперапынны рабочы тыдзень. З боку рабочых мас павінен быць аказаны больш націск на хутчэйшае ажыцьцяўленьне гэтай пастановы на кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў. Усё яшчэ ёсьць выпадкі, калі ва ўзаемаадносінах паміж гаспадарнікамі, парт'ячэйкай і прафсаюзнымі органамі пануюць няяснасьць, блытаніна, ня маюць уплыў на выразнае правядзеньне апэрацыйна гаспадарчых мер-

бесьперапынцы, не атрымала ўсюды практычнай распрацоўкі і не даведзена да шырокіх пралетарскіх мас.

Таму ў далейшай рабоце для забесьпячэньня правядзеньня гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё неабходна:

Устанавіць тэрміны для пераходу на бесьперапынку ўсіх устаноў і прадпрыемстваў па раёне, з вучотам усіх асаблівасьцяй з тым, каб у тэрмін пракантраляваць і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто нядбайна адносіцца да гэтае работы.

Пастанову аб бесьперапынным тыдні зрабіць здабыткам усіх пралетарскіх мас. Для гэтага трэба абгаварыць і намеціць практычныя мерапрыемствы па сходах рабочых, цэхавых сходах, адпрацаваць ва ўсёй сыстэме культурна-масавай работы.

Парт'ячэйкам, прафсаюзам і кіраўнікам устаноў і прадпрыемстваў трэба распрацаваць мерапрыемствы па культурна - масавым абслугоўваньні рабочых, прыстасаваўшы ўсе віды і формы работы ўсіх арганізацый да максымальнага ахопу рабочых.

Парт'ячэйкі павінны прапрацаваць пытаньне аб адзінаначальніцтве ў трыкутніку, што-б забясьпечыла пасьпяховасьць апэрацыйна - гаспадарчай дзейнасьці.

Усю работу па правядзеньні гэтых мерапрыемстваў трэба паставіць пад агонь самакрытыкі мас і забясьпечыць поўнае разуменьне палітычнай сутнасьці пастаноў партыі шырокімі рабочымі масамі. Ад таго, наколькі будуць прапрацаваны, прадуманы гэтыя пастановы і як шырока мабілізуем наўкола іх грамадзкую думку, залежыць пасьпяховае правядзеньне ў жыцьцё гэтых пастаноў.

КОНЮХАЎ.

Памяці старога бальшавіка і адданейшага члена камуністычнай партыі т. Лепсэ

З адозвы прэзыдыуму УсеЦСПС да ўсіх членаў прафсаюзаў, да ўсіх рабочых і работніц СССР

МАСКВА, 7. Памёр стары бальшавік, адданейшы член камуністычнай партыі, цьвёрды рэвалюцыянэр і верны сын рабочае клясы т. Лепсэ.

Заслугі т. Лепсэ перад прафрухам СССР вельмі вялікія. Выключная працаздольнасьць, адданасьць справе пралетарыяту, нязвычайная ўважлівасьць і клапатлівасьць аб штодзённых патрэбах рабочых, надавалі т. Лепсэ рэдкі аўтарытэт і шырокую папулярнасьць сярод мэталістых і ва ўсім прафруху СССР. Пад яго кіраўніцтвам саюз мэталістых зрабіў вялізную работу ў пэрыяд аднаўленьня народнае гаспадаркі і зараз стаў актыўным застрэльшчыкам індустрыялізацыі і рэканструкцыі нашай прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Тав. Лепсэ з 1921 г. да канца свайго жыцьця быў членам прэзыдыуму УсеЦСПС.

Тав Лепсэ прымаў вельмі актыўны ўдзел ва ўсёй міжнароднай рабоце УсеЦСПС. На міжнародных зьездах і кангрэсах т. Лепсэ з посьпехам абараняў і праводзіў ідэю рэвалюцыйнай і клясавай салідарнасьці пралетарыяту. Памяць аб ім натхняе нас на барацьбу за сацыялістычную перабудову грамадзтва, за камунізм.

Патроім нашу энэргію ў справе індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі!

Узмоцнім барацьбу за генэральную лінію партыі, якая забясьпечвае канчатковую сусьветную перамогу рабочае клясы!

ТАНК ІМЯ ТАВ. ЛЕПСЭ

МАСКВА, 7. Замест вянка на магілу т. Лепсэ ЦК УсеКП(б) уносіць 500 руб. на танк імя Лепсэ 1. 1.

Вынас урны з прахам т. Лепсэ адбудзецца 8-га кастрычніка. (ТАСС).

***

МАСКВА. Камісія па арганізацыі пахаваньня т. Лепсэ рэкамэндуе ўсім арганізацыям, асобным таварышом, замест вянкоў уносіць сродкі на пабудову танка імя Лепсэ. (ТАСС).

Пахаваньне тав. Лепсэ

МАСКВА. 8-га кастрычніка адбылося паахваньне т. Лепсэ. З дому Саветаў да Краснага пляцу ўрну з прахом Лепсэ несьлі т. т.Молатаў, Арджанікідзе, Рыкаў, Варашылаў, Інгулаў, Яраслаўскі, Кагановіч, Енукідзе, Дагадаў і інш. Ад імя ЦК УсеКП(б) выступіў Кагановіч, ад імя ўраду СССР—тав. Рыкаў.

Памяці тав. Лепсэ

Жалобнае пасяджэньне беларускага камітэту саюзу мэталістых

Учора адбылося жалобнае пасяджэньне прэзыдыуму Беларускага камітэту саюзу мэталістых, прысьвечанае памяці памёршага старшыні ЦК саюзу мэталістых т. Лепсэ.

Памяць тав. Лепсэ была ўшанавана ўставаньнем.

У вынесенай рэзалюцыі Беларускі камітэт зазначае, што ў асобе т. Лепсэ

справе рэвалюцыі і сацыялістычнаму будаўніцтву, а саюз мэталістых — арганізатара і заслужанага кіраўніка.

Саюз мэталістых заклікае ўсіх рабочых мэталістых Беларусі згуртаваць яшчэ шчыльней свае рады вакол партыі для выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

ШЭМЯКІН СУД У ХАРБІНЕ

СУД АДМОВІЎСЯ АД ДОПЫТУ СЬВЕДАК

ТОКІЁ, 7. Паводле вестак з Харбіна, прамова пракурора на працэсе 38 зводзілася да наступнага: справа нібы мае міжнародны характар, бо яна магла-б пацягнуць за сабою ваенныя дзеяньні. Віна падсудных, быццам, нясумненна, бо заняткі ў консульстве адбываюцца да 2 гадзіны, а пазьней там нікога няма. Ня маючы падстаў, кітайскія ўлады не арыштавалі-б падсудных.

Пасьля прамовы пракурора суд загадаў выдаліць з залі ўсіх падсудных за выключэньнем 7 «галоўных», ня гледзячы на пратэст абароны супроць гэтага новага парушэньня закону. Потым абаронца Мінскі заявіў, што абарона чакала, што працэс будзе весьціся паводле закону і што па меншай меры будуць у наяўнасьці ўмовы ўсебаковага асьвятленьня справы. Гэтыя законныя чаканьні не апраўдаліся. Справа не расьсьледвана і ніводзін сьведка не дапытаны. Няма ніякіх рэчавых даводаў, хоць-бы ў копіях. Што-ж датычыць спаленых дакумантаў, дык здымкамі даводзіцца, нібы іх паліці Мельнікаў і Знаменскі. Калі гэта так, дык гэта іх права і абавязак, бо ў кожным консульстве ёсьць сакрэтныя дзяржаўныя паперы. У заключэньн . Мінскі заявіў, што суд, відавочна, яшчэ не знаёмы з новым кітайскім кодэксам, бо дзеяньні суду супярэчаць нават кітайскім законам. Суд пазбавіў Мінскага слова і права знаходзіцца ў залі пасяджэньня. Сярод чужаземных юрыстых вялікае хваляваньне. (ТАСС).

***

ТОКІЁ, 6. Паводле вестак з Харбіна, у сувязі з арыштам на станцыі Бухэду ўпоўнаважанага нямецкага консульства адкрытая раздача дапамогі на заходняй лініі стала немагчымай. Пратэст нямецкага консульства ня меў ніякага ўплыву. Улады патрабавалі перадаваць грошы паліцыі, якая сама будзе размяркоўваць іх па сьпісах. (ТАСС).

АДПРАЎКА САМАЛЁТАЎ НА САВЕЦКУЮ ГРАНІЦУ

ТОКІЁ, 6. Як падае «Дэмпо Цусін», у Чачун прыбылі 10 самалётаў з Мукдэна (ТАСС).

УНОСЯЦЬ І ВЫКЛІКАЮЦЬ

Уп. Пракулевіч паводле выкліку Г. Скамароха ўносіць на пабудову самалёту «Чырвоны Партызан Беларусі» 15 руб. і выклікае на гэтую-ж суму **М. Асьвяцімскага** (Мазыр, статбюро), **А. Вальковіча** (НКФ), **Л. Заяца** (НКФ), **А. Цьвікевіча** (НК Аховы здароўя);

па 10 руб.—**С. Барана** (База працкалектыву тутуньпікаў), **І. Савіцкага** (БАН), **Ул. Міхалевіча** (Белдзяржвыдат.).

***

Цэнтральны камітэт сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі паведамляе, што на пабудову самалёту «Сялянская Ўзаемадапамога Беларусі» дагэтуль паступіла 1.532 руб. 37 кап.

Навуковыя працаўнікі **Беларускай Акадэміі Навук і Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна** ўносьлі на пабудову самалёту «Навуковы працаўнік»—553 руб. 69 кап. і выклікаюць навуковых працаўнікоў **БДУ, Вэтінстытуту, Камвузу, Горацкай Акадэміі і адзіночак** пасьледваць іх прыкладу.

***

На пабудову самалёту «Беларускі міліцыянэр» **супрацоўнікі 3-га аддзяленьня Віцебскае міліцыі** ўносяць 1 проц. месячнага заработку; **супрацоўнікі Сіроцінскай райміліцыі** ўносяць 38 руб.; **супрацоўнікі Чашніцкай райміліцыі** ўносяць аднадзенны заработак, а таксама 10 руб., якія прысланы адмаддзелам на палянішэньне быту міліцыі.

***

Халапініцкі райгрупком унёс 181 руб. 33 кап. у фонд абароны краіны і выклікае іншыя райгрупкомы Менскае акругі.

Камісія садзейнічаньня пры Менакрэце уносіць у фонд абароны краіны камісійную ўзнагароду, якую яна атрымала за памяркоўнае падпісі на другую пазыку індустрыялізацыі,—26 руб. 75 кап. і выклікае на аднаведную суму ўсе калектывы Акрфа Беларусі і НКФП.

****

Па СССР

Чырвоныя абозы

УФА, 6. Здача хлеба працягваецца ўзмоцненым тэмпам. У Альшэўскай воласьці сіламі беднаты, камуністых і серадняку арганізаваны 73 чырвоныя абозы, якія здалі 11 тысяч центнэраў. Кулакі процідзейнічаюць хлебазагатоўкам.

***

САЛЬСК, 7. Хлебазагатоўкі па Сальскай акрузе за апошнюю пяцідзёўку па асобных раёнах павысіліся на 400 проц. 4-га кастрычніка поўнасьцю выканалі заданьне станіцы «Пралетарская», Уласаўская і іншыя. Кулакі прабуюць хаваць хлеб

Новыя буйныя калгасы

УФА, 6. Ва Уршакмінскай воласьці, Стэрлітамакскага кантону, арганізаваўся калгас пад назваю «Башкірскі Гігант». Калгас аб'яднае 5 сёл і займае плошчу ў 3.500 гэктараў. Нацыянальны склад калгасу—башкіры, пераважна бядняцтва.

***

ЛЕНІНГРАД, 7. Недалёка ад Ленінграду ўзьніклі буйнейшыя калгасы «Кудрава» на плошчы 1.500 гэктараў, «Уртян»—600 гэктараў. У Чарапавецкай акрузе арганізаваўся калгас «Новы пуць»—на 2.000 гэктарах, у Пскоўскай—«Брыдзіна»—на 2.000 гэктарах. Гэтыя калгасы маюць галойным чынам малочна-гародны і льняводны ўхілы.

Замест рэлігійных сьвят—нядзельнік

(Ад нашага спэц. карэспандэнта)

У Ленінградзе ў зьвязку з яўрэйскімі асеньнімі сьвятамі разгарнулася шырокая антырэлігійная кампанія. Упяршыню кампанія ахапіла масы яўрэйскіх саматужнікаў, жанчын, маладняк. 6-га кастрычніка, у дзень важнейшага рэлігійнага сьвята «Рош-Гашоно» адбыўся вялізарны нядзельнік, у якім прынялі ўдзел да 15.000 яўрэяў-працоўных, рабочых, саматужнікаў, вучняў. Усе саматужна-вытворчыя арцелі працавалі поўным ходам. Увесь збор ад нядзельніка ідзе на пабудову самалёту «Біра-Біджан».

Нельга не адзначыць вялікі энтузіязм, з якім быў праведзены нядзельнік. Ня гледзячы на дждлівае і халоднае надвор'е з самай раніцы 6-га кастрычніка з усіх канцоў гораду паплылі да зборных пунктаў групы ўдзельнікаў нядзельніка. Да 7-й гадзіны раніцы ўсе былі разьмеркаваны і накіраваны на работу—на заводы, у порт, вадаправодную станцыю і інш.

М. Гохфэльд.

„РОЗНАБАКОВАЯ" ДЗЕЙНАСЬЦЬ ПЛЯЧКАЙЦІСА

КОЎНА, 4. Орган партыі народнікаўсялян «Летувос Жыніос» паведамляе, што ў газэце літоўскіх эмігрантаў «Пірмін» апублікаваны сэнсацыйны артыкул аб Плечкайцісу. Аўтар артыкулу эмігрант Анцэвіч сьцьвярджае, што дзейнасьць гэтага лідэра літоўскіх эмігрантаў польскай арыентацыі мае правакацыйны характар.

Па словах «Летувос Жыніос», эміграцкая газэта прызнае, што, будучы членам літоўскага сойму, ПЛЯЧКАЙЦІС СЛУЖЫЎ У ПАЛІТЫЧНАЙ ПАЛІЦЫІ.

Паражэньне войск Хабібулы

ТЭРМЭЗ, 5. Паводле атрыманых вестак, пасьля заняцьця кугістанцамі Джэлалабада Надзір Хан распачаў контр-наступленьне ў даліне Лёгара ў кірунку на Кабул. Пасьля некалькіх баёў войска Надзір Хана заняло рад пасяленьняў і адрэзала Джэлалабадзкую групу кугістанцаў. Хабібула выслаў усе сілы, якія знаходзіліся ў Кабуле, на абарону сталіцы. Кугістанцы тэрмінова вывозяць маемасьць і жонак з Кабула ў Кугістан.

***

Арганізацыя трактарнай калёны ў Гомельшчыне

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Райсаюз адпусьціў 20 тыс. руб. на закупку 20 трактараў для калгасаў Гомельскае і Мазырскае округ. Газэта «Палеск. Правда» распачала збор сродкаў на арганізацыю трактарнай калёны імя газэты „Палеская Правда». Супрацоўнікі рэдакцыі ўжо адлічылі аднадзенны заработак.

Гэктары ў фонд індустрыялізацыі

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). У в. Хоўлха, Уваравіцкага раёну сяляне зацвялі два гэктары зямлі ў фонд калектывізацыі. Акрамя таго, наладжана дапамога беднаце ў часе асеньняй сяўбы. Прыступлена да арганізацыі машына-пракатнага пункту.

Адкрыўся зьезд францускага камсамолу

ПАРЫЖ, 7. Адкрыўся зьезд францускага камсамолу. Прадстаўнік маладой гвардыі заклікаў дэлегатаў улічыць урокі сутычкі рабочай моладзі з сацыялістымі, якіх падтрымлівала паліцыя, і ўзмацняць атрады маладое гвардыі для актыўнага процідзеяньня буржуазнай рэакцыі і сацыял-фашызму. Потым зьезд прыймае прывітаньні зьезду КІМ'у, УсеЛКСМ, уральскім камсамольцам, якія зьяўляюцца шэфамі францускага камсамолу, далей Чырвонай армії і Спортінтэрну.

Адзін з членаў ЦК камсамолу выступіў з палітычнай справаздачай. Дакладчык падкрэсьлівае, што барацьба за легальнае існаваньне камсамолу зьяўляецца не барацьбой за прызнаньне буржуазіяй фармальнага права на існаваньне, а формай мабілізацыі мас рабочай моладзі на барацьбу з рэакцыяй і капіталістычнай эксплёатацыяй. Гэта зусім не выключае падрыхтоўкі да магчымага пераходу ў падполле. Адна з бліжэйшых канкрэтных задач францускага камсамолу—падрыхтоўка скліканьня шырокага ўсефранцускага кангрэсу рабочай моладзі. (ТАСС).

***

ПАРЫЖ, 7. У выніку сутычкі ў Жані паранена звыш 100 камуністых і 20 сацыялістых, пацярпела 20 паліцэйскіх. Рабочыя арганізацыі і сходы ўхваляюць рэзалюцыі, у якіх ганьбяць сацыял-фашыстых. «Юманітэ» зазначае, што француская сацыялістычная партыя шпаркімі крокамі ідзе па шляху фашызацыі, раўняючыся па Цэргібэлі.

Сацыялістычная партыя ў Лілі складаецца з паліцэйскіх агентаў

ПАРЫЖ, 8. У Лілі пад узмоцненай аховай паліцыі адбыўся скліканы сацыялістычнай партыяй мітынг з удзелам Рэнадэля, Фора і інш. сацыялістычных лідэраў. Сакратар вобласнага камітэту кампартыі Рамэт, які зьявіўся на мітынг у якасьці апанэнта, ня быў дапушчаны на мітынг, і па патрабаваньні сацыялістых быў арыштаваны паліцыяй, якая разагнала сабраўшыхся каля ўваходу ў залю рабочых.

Акрамя Рамэта па ўказаньні сацыялістых былі арыштаваны яшчэ трое рабочых.

Група камуністычных рабочых накіравалася да паліцэйскага камісарыяту, дамагаючыся вызваленьня арыштаваных з крыкамі: «Няхай жыве амністыя», «прэч вайну», «прэч сац.-фашыстых».

Як падае «Юманітэ», амаль усе паліцэйскія агенты ў Лілі зьяўляюцца членамі сацыялістычнай партыі. Лілскі карэспандэнт «Юманітэ» паведамляе, што калі каля будынку, дзе адбываўся мітынг, зьявіліся камуністычныя рабочыя, дык сацыялістых ахапіла паніка, але паліцэйскія ім крычалі: «ня бойцеся, мы вас ахоўваем».

Белы тэрор у Польшчы ўзмацняецца

ПРАКУРАТУРА ПАТРАБУЕ ВЫДАЧЫ СУДУ КАМДЭПУТАТАЎ РОСЯКА І СЫПУЛЫ

ВАРШАВА, 8. Пракуратура Варшаўскага, Беластоцкага і Гарадзенскага акруговых судоў у бліжэйшы час завернецца ў сойм з просьбай аб выдачы суду камуністычных дэпутатаў Росяка і Сыпулы. Супроць гэтых дэпутатаў-камуністых фабрыкуецца справа аб арганізацыі мітынгу без дазволу ўлад, анты-дзяржаўных выступленьняў і «аб зьнявагах прэзыдэнта рэспублікі». Янія факты будуць пакладзены ў аснову гэтага абвінавачаньня—застаецца невядомым.

Пэпээсаўскія баявыя дружыны складаюцца з крымінальных элемэнтаў

ВАРШАВА, 3. «Пшэдсьвіт» (орган групы Яваро́ўскага) абвінавачвае цэнтральны камітэт ППС у тым, што, ведаючы, што ў радох пэпээсаўскай баявой дружыны ў Варшаве ёсьць яўна крымінальныя элемэнты, замоўчвае гэта і ня ўжывае ніякіх мер для чысткі дружыны ад гэтых элемэнтаў. З свайго боку ППС зусім справядліва заяўляе, што баявая дружына групы Яваро́ўскага сама складаецца з крымінальнага элемэнту. Бакі абвінавачваючы адзін аднаго, бязумоўна, маюць рацыю. **Баявыя арганізацыі, як ППС, так і Яваро́ўскага сталі сапраўднай язвай рабочых раёнаў, асабліва ў Варшаве.**

Пэпээсаўскія лёзунгі і сапраўднасьць

ВАРШАВА, 7. ППС назначыла на нядзелю зьезд моладзі. Дэманстрацыі, зразумела, загадзя былі ўгоднены з паліцэйскімі ўладамі. На папярэдніх мітынгах, між іншым, быў высунуты лёзунг «Прэч Пілсудскага», што зьявілася для паліцыі сыгналам да разгону дэманстрацыі. Моладзь аказала паліцыі актыўнае супраціўленьне, пры чым адзін паліцэйскі быў паранены. З прычыны гэтага, паліцыя забараніла дэманстрацыі ў нядзелю. Пэпээсаўскі «Роботнік» адмяжоўваецца ад суботняга выступленьня моладзі, якая будучы не даволі спакушана, прыняла ўсур'ёз лёзунгі пэпээсаўскіх правадыроў. (ТАСС).

Дэманстрацыі мэталістых у Варшаве

ВАРШАВА, 7. У розных пунктах Варшавы адбываліся дэманстрацыі мэталістых, скліканыя левай фракцыяй прафсаюзаў. Паліцыя разагнала дэманстрацыі. У працягу апошняга тыдню на ўсіх буйных мэталёвых прадпрыемствах адбыліся масоўкі, дзе, побач з эканамічнымі патрабаваньнямі, выносіліся і палітычныя рэзалюцыі супроць фашызму, супроць белага тэрору ў адносінах да палітычных зьняволеных і за абарону СССР. (ТАСС).

Правал пілсудчыкаў на камунальных выбарах у Познанскім і Паморскім ваяводзтвах

ВАРШАВА, 7. Адбыліся камунальныя выбары ў Познанскім і Паморскім ваяводзтвах. У Познані блёк рабочага адзінства атрымаў 4 мандаты, пэпээсаўцы—2, пілсудчыкі, якія выступаюць пад трох сьпісах, усяго 3 мандаты, немцы—два мандаты і народны дэмакраты—33 мандаты. Характэрны вынік — расчараваньне ў ліку ўплыву нарадовых дэмакратаў і агульнае ліку галасоў, паданых за пілсудчыкаў і пілсудчыкаў. Такім-жа провалам пілсудчыкаў скончыліся выбары і ў Паморскім ваяводзтве. Польскае тэлеграфнае агенцтва і ўрадавы друк пачога не паведамляюць аб выніках выбараў. (ТАСС).

Арышт удзельніка замаху ў 1921 г.

ВАРШАВА, 5. У Львове арыштаваны Яраслаў Чыж, удзельнік замаху на Пілсудскага і Львоўскага валяводу Грабоўскага ў 1921 годзе. Чыж у той час у мундзіры маёра войск польскіх дапамагаў наладзіць замах і меў сваім заданьнем даць магчымасьць уцячы галоўнаму ўдзельніку замаху Фэдаку. Пасьля замаху Чыж эміграваў у Чэхію, потым у Канаду і толькі нядаўна вярнуўся ў Львоў. У сувязі з яго арыштам «Глос Прадзы» піша, што польскай паліцыі ўдалося выкрыць цэнтр украінскае вайсковае арганізацыі.

Перад забастоўкаю рабочых варшаўскага магістрату

ВАРШАВА, 5. Дэлегацкі сход працаўнікоў усіх прадпрыемстваў Варшаўскага магістрату пастанавіў дамагацца неадкладнае выплаты адпаразовае дапамогі ў 75 проц. месячнае зарплаты і выкананьня ўсіх раней заяўленых патрабаваньняў. У выпадку адмовы яшчэ на гэтым тыдні будзе абвешчана забастоўка. («Раб.»).

Канфіскацыі

ВАРШАВА. У Катовіцах канфіскавана пэпээсаўская газэта «Газэта Работніча» за артыкулы: «Няма правы», «Саюзьнікі санацыі» і «Чаму пракурор не абвяшчае вынікаў сьледзтва».

(«Раб.» 274).

— У Вільні канфіскавана літоўская газэта «Вільніаус Рыюс» за артыкул аб прычынах адстаўкі праф. Вальдэмараса. («К. Віл.» 222).

— У Кракаве канфіскаваны пэпээсаўскі «Напшуд» за 27-IX за артыкул аб дзейнасьці ўрадавага камісара ў Кракаўскай касе хворых. («Раб.» 275).

— У Львове канфіскаваны пэпээсаўскі «Дзеньнік Людовы» за артыкулы: «Палітычныя рэпрэсіі» і «Масавыя звальненьні ў касе хворых Львова». («Раб.» 275).

МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 3. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе аб мілітарызацыі чыгуначнікаў, якія ўключаны ў спэцыяльную сетку арганізацыі па вайсковай перападрыхтоўцы. У некаторых мясцох чыгуначнікі ўжо прымалі

Несьвіж—Дзікаў—Несьвіж

За час ад маёвага перавароту да нечаканага зьяўленьня Пілсудзкага ў старым замку князёў Радзівілаў у Нясьвіжы, сёй-той у Польшчы перажыў не адно горкае расчараваньне і зжыты шматлікія ілюзіі, якія зьвязваліся з імем Пілсудзкага. Падарожжа Пілсудзкага на паклон да Радзівілаў зьявілася ў свой час немалой сэнсацыяй. Падарожжа па паклон да магнатаў зямельнае арыстакратыі, да вядомых крэсавых зуброў, было моцным ударам для прыхільнікаў Пілсудзкага, якія засяваюць на левых лаўках сойму. Але з другога боку, гэта падарожжа біла таксама па групе правых палітыкаў, якія ў той час яшчэ не ласьнелі ачухацца ад разгрому, створанага Пілсудзкім у маі. Правыя, у якіх не загаіліся яшчэ маёвыя раны, цешылі сябе надзеяй, што марш Пілсудзкага на Варшаву быў ня толькі ўдарам па іх асабіста, але і паходам супроць тых клясаў, прадстаўнікамі якіх правыя дагэтуль сябе лічылі. Урачысты прыём з боку прадстаўнікоў радавітае зямельнай арыстакратыі маршалу-бунтаўшчыкоў, былому палітычнаму арыштанту і тэарыстаму, кінуў яскравае сьвятло на сапраўдную клясавую падаплёку майскага перавароту.

Але майскі пераварот быў зроблен яшчэ ня так даўно. У вушах стаяў яшчэ гул ад гармат, якія расчышчалі шлях маршалу Пілсудзкаму ў Бэльвэдэр. Яшчэ не зарасла травой брацкая магіла загінуўшых на адрэзку фронту ад каралеўскага палацу да маршалкаўскага Бэльвэдэру. Таму візыт Пілсудзкага ў Несьвіжы быў абстаўлены такою таямнічасьцю.

Таму быў такія туманныя прамовы, якія гаварыліся ў старых рыцарскіх залях. Гэтым тлумачыцца той нясьмелы тон, з якім высоўваліся патрабаваньні гаспадароў і туманныя абяцаньні дарагога госьця.

Ня гледзячы на ўсю гэту дэкарацыю, значэньне візыту Пілсудзкага ў Несьвіж ня ўзбуджала ніякіх сумненьняў. Пасьля Несьвіжу адбылася вядомая нарада Славэка з аграрыямі ў маёнтку князя Любамірскага ў Дзікаве. У Дзікаве было менш урачыстасьцяй, чым у Несьвіжы, але затое там адбыўся адкрыты торг. У выніку Дзікава—вырас перадвыбарны блёк новых кіраўнікоў Польшчы з самай рэакцыйнай і кансэрватыўнай групоўкаю.

Пасьлямаёвы лятер набыў у асобе аграрыяў другую падпорку пасьля буйное прамысловасьці. Гэтыя падпоркі павінны былі падперці новы будынак фашызму, які будуецца ў Польшчы. У выніку Дзікава, кансэрватыўны друк стаў поўнадавым, і ў сойме побач з былым тэарыстым Славэкам заняў месца сапраўдны арыстакрат Радзівіл.

Ад першага наведаньня Несьвіжа, прайшло ня мала часу, на працягу якога паасобныя часткі ўрадавага блёку—буйныя прамыслоўцы і памешчыкі—выступалі ўсё менш саромліва. Новыя людзі ў польскай палітыцы хутка абнаглелі. Арыстакраты загаварылі новай мовай новых палітычных формул. Заштатны журналісты Мацкевіч з манархічнага віленскага «Слова» пачаў больш упэўнена выкладаць свае думкі і са вьдзіўляючай разьвязнасьцю ставіць кропкі над «і».

Па ўсіх правілах стратэгіі разгарнулася **наступленьне прамыслоўцаў на жыцьцёвы ўзровень рабочага і на яго сацыяльныя заваёвы. Пакладзены пад сукно ўсе праекты аграрнай рэформы і міністра зямляробства Незабыткоўскі не пасароміўся адкрыта заявіць у друку, што безьзямельнаму сялянству патрэбна перш за ўсё культура, а потым ужо зямля, бо «нельга даць дзікуну ў рукі дарагі гадзіньнік».** Афіцыйна агалошаны курс на высокія хлебныя цэны ў імя выратаваньня аграрыяў ад эканамічнае згубы. Рабочы паёк скарачаецца двойчы—на карысьць капіталістых, а потым на карысьць аграрыяў.

Плады Несьвіжу і Дзікава хутка высьпяваюць пад праменьнямі фашысцкага сонца.

І вось несьвіскі замак Радзівіла зноў бачыць гасьцей у сваіх сьценах. Замак Радзівілаў наведаў у часе свайго аб'езду Заходняе Беларусі прэзыдэнт польскай рэспублікі Масьціцкі.

На гэты раз у Несьвіжы вядуцца зусім іншыя гутаркі. Тон гаспадароў многім адзначаецца ад тону ў часе візыту Пілсудзкага. Мацкевіч, рэдактар «Слова», на гэты раз адкрыта наведамляе, што князь Чэцьвертынскі, які выступаў на ўрачыстым банкеце, сказаў прамову, якой дакрануўся [illegible] «галоўным чынам, гаспадарчых праблем». Гаварылася, аднак, ня толькі аб гаспадарчых праблемах. Аб палітыцы гаварыў другі прамоўца на гэтым банкеце—князь Юндзвіл, старшыня саюзу крэсавых (украінных) абшарнікаў. У пачатку сваёй прамовы Юндзвіл падкрэсьліў, што гаворыць ад імя ўсіх украінных аграрыяў. «Варожыя сілы,—заяўляе Юндзвіл,—не змаглі сьцерці з зямлі аграрыяў, за якую яны ўдаржна трымаюцца». Далей Юндзвіл падкрэсьліў, што ў моры нацыянальных разьлялосьсяў украінныя аграры заўсёды прадстаўлялі ідэю польскай дзяржаўнасьці. На гэтай слоўнай канве быў вышыты ўзор, які атрымаў у прамове Юндзвіла наступнае афармленьне: «Зямля, якая выходзіць з-пад нашага ўладаньня, зусім страчана. Усякі павеў ветра можа зьмесьці новых яе ўласьнікаў. І таму шкоду робіць бацькаўшчыне той, хто пры дапамозе закону або эканамічных мерапрыемстваў прабуе пазбавіць украінных аграрыяў іх спадчыны»...

Характэрна, што гэту прамову Юндзвіла не зьмясьціла ніводная газэта, апрача манархічнага «Слова». Сэнс гэтай прамовы не выклікае ніякіх сумненьняў. Яна атрымала поўнае ўхваленьне манархічнага «Слова» і яе рашучага рэдактара. Больш таго, «Слова» лічыць неабходным, наперакор афіцыйным паведамленьням ПАТ'а аб «усенародным радасьці» ў сувязі з прыездам прэзыдэнта ў Заходнюю Беларусь [illegible] ўнесьці сваю паправку. Паказваючы, **што ня ўсе сяляне падзяляюць гэтыя захапленьні.**

Не выпадковая балбатня рэдактара манархічнага «Слова» ў апублікаваньні прамовы Юндзвіла, якую іншы друк стараўся змоўчаць. Не выпадкова таксама, што рэдактар «Слова» апісвае ўрачыстасьці, зьвязаныя з прыездам прэзыдэнта, зусім ня так, як іх прабаваў прадставіць афіцыйны ПАТ. Усё гэта сьведчыць аб тым, што этап, які прайшлі аграрыі ад Несьвіжа праз Дзікаў да другога Несьвіжа, пакінуў свае сьляды. **Аграрыі адчулі свае значэньне і голас іх стаў больш цьвёрдым і патрабаваньні больш пэўнымі. Яны ўжо ня толькі патрабуюць, але пагражаюць.** Ад першага Несьвіжу да другога адлегласьць вялізная. У выніку трох год фашысцкай дыктатуры, румянец заіграў на шчоках крэсавых абшарнікаў.

А.РЖЭВУСКІ

Варшава 30/9-29 г.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Чыстка савецкіх парт'ячэек павінна зьявіцца аглядам іх дзейнасьці і барацьбы за працаздольны клясава-вытрыманы апарат

Вышэй сьцяг самакрытыкі і актыўнасьці мас на праверачных сходах, за рашучае ачышчэньне партыі ад бюракратаў, шкурнікаў і тых, хто няздольны ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі

Разам з масамі беспартыйных правяраем работу ячэйкі

(Ячэйка КП(б)Б хэмікаў, Менск)

З 4-га кастрычніка пачалася праверка ячэйкі КП(б)Б хэмікаў. Гэта ячэйка абслугоўвае каля 150 рабочых і служачых розных прадпрыемстваў і ўстаноў. Па адным толькі гарадзкім мясцкоме налічваецца каля 80 рабочых і служачых, а гэты мясцком абслугоўвае каля 23 прадпрыемстваў і ўстаноў. Гэтыя акалічнасьці не маглі не перашкаджаць у рабоце ячэйкі. На слабасьць масавай работы і слабую сувязь ячэйкі з рабочымі некаторых прадпрыемстваў зьвярталі ўвагу таварышы, якія выступалі ў спрэчках па дакладу сакратара аб рабоце ячэйкі на першым праверачным сходзе. Культае таксама і палітвучоба: амаль усе адказныя працаўнікі не займаюцца палітадукацыяй.

На адкрытыя сходы ячэйкі, на якіх ставіліся пытаньні, галоўным чынам, гаспадарчыя і прафэсыянальныя, заўсёды добра хадзілі рабочыя і актыўна ўдзельнічалі ў іх рабоце. За апошні час ячэйка прыняла ў партыю 3-х рабочых з вытворчасьці, у тым ліку адну жанчыну. Аўтарытэтам сярод масы ячэйка карыстаецца. Дзякуючы кіраўніцтву ячэйкі, добра праходзіць сацспаборніцтва на заводзе «Чырвоны Хэмік»; у часе спаборніцтва рабочыя добраахвотна павысілі сабе норму выпрацоўкі з 3-х да 10-ці, прадукцыйнасьць працы ўзьнялася на 17 проц., зьніжаны сабекошт на 7,6 проц. і г. д. Зусім зьніжчаны прагулы і спазьненьні на працу.

Ячэйка правяла досыць добра падрыхтоўчую работу да чысткі. На праверачных сходах беспартыйныя рабочыя складаюць 70-75 проц. Але тут дапушчана памылка: ячэйка хэмікаў, у якой праходзіць праверку партыйцы, што зьяўляюцца членамі прэзыдыуму ЦП саюзу, не запрасіла на сходы ні гаспадарнікаў, ні рабочых буйнейшага ў горадзе прадпрыемства саюзу хэмікаў—гуты «Пралетары». Частку віны за гэта павінна ўзяць на сябе і парт'ячэйка заводу «Пралетары», якая, ня гледзячы на абвесткі ў газэтах, ня прыслала на праверачны сход партыйцаў і рабочых свайго прадпрыемства. Праверачныя сходы праходзяць актыўна, па дакладу аб рабоце бюро выказалася больш за 20 таварышоў. Таксама выступаюць актыўна беспартыйныя рабочыя. Быў выпадак спробы зьвядзеньня асабістых рахункаў. Былы працаўнік заводу «Чырвоны Хэмік» выступіў супроць адной партыйкі, якая ў свой час выкрывала шкодную работу гэтага «працаўніка». Але праверком сваячасова выкрыў гэтага «актывістага», які пад аднадушнае абурэньне сходу прымушаны быў пакінуць залю сходу.

Так праверком выкрывае ўсе недахопы і хібы ў рабоце ячэйкі кожнага партыйца паасобку.

ПАРТЫЕЦ.

◆◆◆ Дукшт перад судом мас ◆◆◆

Дасюль жыцьцё невялічкай ячэйкі **Наркамгандлю** не вызначалася асаблівым ажыўленьнем. Нельга сказаць, што не працавалі: пасяджэньняў было шмат, рэзалюцый таксама. Але, аднак, чагосьці не хапала. Чаго-ж?

Самакрытыкі. Калі сакратар ячэйкі тав. Іофэ рабіў справаздачу на праверачным сходзе, ён літаральна, сказаў так:

— **«Зажыму ня было, але і самакрытыкі ня было».**

Супярэчліва, але сымптаматычна. Некаторыя з выступаўшых т.т. паправілі сакратара, сказаўшы проста: **ня было самакрытыкі.**

Здаецца, што такая фармулёўка блізка да сапраўднасьці. Члены ячэйкі ня дрэнна ведалі адзін другога па рабоце ва ўстанове — маглі сказаць: «гэта дрэнны інспэктар, а гэта добры». Але яны не маглі сказаць з такой-жа пэўнасьцю: **«гэта ўзорны партыец, а гэта—не».**

Лепш за ўсё гэта высьветлілася пры праверцы члена ячэйкі **Дукшта.** Прыклад з ім досыць цікавы, каб на ім спыніцца.

Дукшт — інспэктар Наркамгандлю і член партыі з 1919 году. Калі старшыня камісіі прачытаў яго прозьвішча, у залі, дзе сядзелі служачыя ўстановы і рабочыя шпалернай фабрыкі, прайшоў лёгкі шумок... Сход чакаў гэтага прозьвішча.

А да гэтага сядзеўшыя ў залі ўважліва слухали біяграфіі і правяралі т. т. работніцу-вылучэнку Пятроўскую, Абрамава, Верамейчыка, даўшы аб іх добры водзыў.

Масу не ашукаеш: на т. Дукшце яна затрымала сваю ўвагу больш, чым на гадзіну. Дукшт апавядаў:

— Служыў ў царскай арміі. У дні рэвалюцыі быў выбраны ў савет салдацкіх дэпутатаў. Якое палітычнае лініі трымаўся — **ня памятаю:** спачуваў і бальшавіком і меншавіком і эсэрам.

— За каго галасаваў пры выбарах ва Ўстаноўчы Сойм? — раздаўся нэрвовы голас з залі.

Дукшт, не зьмяняючы голасу, адказвае: «Ня памятаю». І дадае: «Пры чысткі ў 1924 г. мяне палічылі ніпчырым у гэтым адказе і далі вымову».

Заля хвалюецца і засыпае Дукшта пытаньнямі. І вось тут можна было яскрава наглядаць клясавую чуласьць мас, іх шчырую зацікаўленасьць чыстатою і годнасьцю члена бальшавіцкай партыі. І траба праўду сказаць, хваляваньне аўдыторыі ня было беспадстаўным: пад яе націскам Дукшт, нарэшце, «удакладняе» свае словы: аказваецца ён быў прапаршчыкам у царскай арміі (аднак, ня ведаў, за каго галасаваў?), а бацька на яго словах, «захудалы дваранін» і ўладар ветрака-млыну ў Бельскім павеце, былое Смаленскай губ.

Дукшт служыў і ў Чырвонай арміі, прысутныя, зразумела, заўважаюць гэта, але ад свайго здаровага падазрэньня да яго не адмаўляюцца.

— Скажэце, калі ласка, як у вас з **дэўгамі?** — пытаецца старшыня, трымаючы ў руках нейкую паперку.

— З даўгамі...?! На 1-га красавіка 1929 году было **907** руб., а зараз... каля **600,** — адказвае Дукшт, як быццам чытае баланс, або дакладвае аб рэчах, якія яго не датычаць.

Аўдыторыя больш пільна прыслухоўваецца. Адкуль такі доўг. Дзе яго прычыны? Ці можна гэта апраўдаць?

Ёсьць такія партыйцы, якія, праўду кажучы, досыць вольна адносяцца да даўгоў. Дукшт адзін з такіх, ён прафэсыянальны даўжнік. Даўгі — спадарожнікі яго ўсюды.

— Чэк на 300 руб. ён выпісаў сабе сам у бытнасьць старшынёю Дзіцячай камісіі ў Мазыры... 250 руб. ён пазычыў у таварыша (які, да рэчы, сядзіць зараз у турме па справе Белмясгандлю) і яшчэ «пазычаў» Дукшт па 100, па 20, па 50 рублёў.

— У мяне ёсьць расьпіска, што пазычаныя мною грошы ніякага дачыненьня да растрачаных у Белмясгандлі ня маюць, — эпічна паведамляе Дукшт сходу і далей, не зьмяняючы спакойнага голасу, ён пералічае сваіх шматлікіх «крэдыторaў», у ліку якіх, вядома, ёсьць і Наркамгандаль.

Чым-жа тлумачыць сваю вялікую запазычанасьць Дукшт? — Хворасьцю: ён сыстэматычна хварэе.

— Ну, а рабочы хіба не хварэе, хіба кожны з іх атрымлівае ўжо 160 руб. у месяц?

Гэтыя зусім разонныя пытаньні задаюць Дукшту з валі. Яму дапамагалі, пасылалі на курорт. Дукшт, парушаючы закон, атрымліваў адначасова пэнсію ва ўстанове і дапамогу ў страхкасе. Ён быў зусім бясклопатным да таго, адкуль і як адтрымлівае грошы. Ён не адмаўляе, што калі-б ня быў на адказнай пасадзе, яму-б у Наркамгандлі грошай не далі-б.

Дукшт — хворы чалавек. Але ён член партыі, а апошні, нават і пры самым найцяжэйшым стане, ня мае права на большае, чымся кожны радавы рабочы. А Дукшт, акрамя таго, зьяўляецца **старшынёю мясцкому.**

Вось бытавая характарыстыка Дукшта. Яшчэ адна маленькая рыса з яго палітычнай падрыхтоўкі. Калі яму насталі два простыя запытаньні з гісторыі партыі (наконт жнівеньскага блёку і ацэнкі рэвалюцыі 1905 г. меншавікамі), Дукшт красамоўна нахіліў галаву і застаўся бясслоўным. **Ня ведаў.**

Некаторыя з членаў ячэйкі прабавалі абараняць Дукшта, характарызавалі яго, як добрага працаўніка-спэцыялістага па мясе, спасылаліся на «нечаканасьць» усяго вышэйсказанага. Магчыма, што Дукшт і ня дрэнны працаўнік. Але яго абаронцы забыліся пра адну бальшавіцкую ісьціну: характарызаваць партыйца ня толькі па яго «спэцыяльнасьці», але і па партыйных якасьцях: дысцыпліне, этычнасьці, **узорнасьці.**

Ці ня ясна, што Дукшт забыўся пра гэтыя бальшавіцкія запатрабаваньні. Праверачная камісія, улічваючы ўсе моманты ў абвінавачваньні Дукшта, парашыла ўважліва расьсьледаваць і разабраць яго справу.

Але яна, зразумела, улічыць той прысуд рабочай аўдыторыі, якая, крытыкуючы ўчынкі члена партыі Дукшта, ужо выразна адказала:

— Дукшт **заслужыў і павінен панесьці суровую кару.**

А нашым савецкім ячэйкам трэба раз назаўсёды рашуча паставіць перад сабою запытаньне ці ведаюць яны сваіх таварышоў, як членаў партыі?

Самакрытыка па сакрэту

(Ячэйка КП(б)Б Белкаапсаюзу)

Пытаньне аб разгортваньні самакрытыкі ў Белкаапсаюзе стаіць вельмі ня добра. Яскравым прыкладам можа служыць наступны характэрны факт. Гэтымі днямі па дырэктыве бюро парт'ячэйкі было па аддзелах склікана некалькі сходаў супрацоўнікаў, на якіх абгаворваліся пытаньні аб разгортваньні самакрытыкі, аб прычынах невыстарчальнага ўдзелу калектыву ў барацьбе за паляпшэньне мэтадаў работы ўстановы, аб бюракратызьме і інш. Аднак, на гэтых сходах маглі прысутнічаць ня ўсе, якія жадалі. Праводзіўся сход супрацоўнікаў некалькіх аддзелаў 4 кастрычніка. Прыходзіць на яго старшыня мясцкому т. Каждан. Старшыня сходу тав. Коцін (член партыі) робіць яму рукою знак — «выходзь». І тав. Каждан ідзе за дзьверы. Праз некаторы час прыходзіць на сход галоўбух, і яго папрасілі пакінуць сход, бо... абгаворваецца пытаньне аб самакрытыцы. Таксама ня быў дапушчан на адзін з такіх сходаў член мясцкому т. Кудзіновіч.

Калі некаторыя члены ячэйкі на пасяджэньні бюро зьвярнулі ўвагу сакратара ячэйкі тав. Левіта на недапушчальнасьць правядзеньня такіх сходаў пры зачыненых дзьверах, выявілася, што сакратар ячэйкі тав. Левіт сам «раіў» старшыні мясцкому т. Каждану не наведваць гэтых сходаў, бо «ў прысутнасьці старшыні мясцкому ў супрацоўнікаў ня хоціць сьмеласька выказвацца». На старшыню мясцкому т. Каждана сапраўды была надрукована заметка ў «Нашей газете», якая абвінавачвала яго ў бюкратызьме, зажыме самакрытыкі і г. д.

Бюро ячэйкі пры абгаварэньні гэтага пытаньня павінна было адказаць выразна на наступнае пытаньне: ці ўхваляе яно такі мэтад разгортваньня самакрытыкі ці не. І пасьля доўгіх спрэчак бюро пастанавіла: «лічыць упушчэньнем недапушчаньне на сходы супрацоўнікаў». Але ўсё ж такі гэта «упушчэньне»? Хто гэта «упушчэньне» зрабіў? Хто вінаваты ў гэтым «упушчэньні»? Пра гэта ні слова. Выпадкова гэта ці не. Не, не выпадкова. Старшыня сходу тав. Коцін заявіў на бюро, што яго абаламуцілі некаторыя члены бюро, якія запрапанавалі яму не дапушчаць на сходы памянёных асоб.

Партыя ня раз папераджала супроць апаганеньня самакрытыкі, супроць вульгарызацыі гэтага важнейшага лёзунгу партыі. Калі-ж ячэйка Белкаапсаюзу навучыцца правільна выконваць партыйныя дырэктывы?

У надыходзячую чыстку праверком павінен зьвярнуць на гэта сваю ўвагу.

ПАРТЫЙЦЫ.

Працоўны ўдзел у аб'яднаньні аб усебеларускай выстаўцы

Наркамасьветы, прафсаюзы і акрвыканкомы нічога не зрабілі для папулярызацыі выстаўкі сярод рабочых і сялянскіх мас

Восьнью 1930 году ў Менску будзе адкрыта ўсебеларуская выстаўка сельскае гаспадаркі і прамысловасьці. Галоўная задача выстаўкі паказаць дасягненьні БССР за 10 год і шляхі далейшага разьвіцьця яе прамысловасьці і перабудовы сельскае гаспадаркі праз калектывізацыю на новы сацыялістычны лад.

Здаецца, што такая важная справа, як арганізацыя выстаўкі, павінна быць шырока папулярызавана сярод працоўных як гораду, так і вёскі. На справе, мы сустракаемся з бюракратычным фармальным падыходам да гэтай справы. Матар'ялы аб выстаўцы, не зьмесьце ўжо даўно разасланы па акругах і ўстановах. Але ў нас яшчэ амаль што нічога ня зроблена, каб азнаёміць шырокія масы працоўных з задачамі выстаўкі і самой выстаўкай наогул.

У свой час Наркамасьветы было прапанавана правесьці растлумачальную работу аб выстаўцы праз палітасьветныя ўстановы, хаты-чытальні і інш. сярод шырокіх колаў батрацтва і бядняцка-серадняцкага сялянства. **Але Наркамасьветы ў гэтай галіне нічога не зрабіў. Таксама нічога не зрабілі выканкомы і прафсаюзы. Па акругах падрыхтоўка да ўсебеларускай выстаўкі таксама не разгорнута.** Па некаторых акругах яшчэ даўгулі не арганізаваны выставачныя камітэты пры райвыканкомах і сельсаветах. **Такім чынам, шырокія масы рабочых і сялянства мала ведаюць аб тым, што тут у Менску мы рыхтуем грандыёзную выстаўку і што гэтую выстаўку мы павінны адкрыць у наступным 1930 годзе.**

Як ідзе падрыхтоўка самой выстаўкі? Пры складаньні пляну выстаўкі мы сутыкнуліся з фактамі нядбайных адносін да выстаўкі з боку некаторых спэцыялістых Наркамзему і НДІ, нават з яўнымі спробамі зрыву выстаўкі.

Некаторыя спэцыялістыя прышчэпаўскай школы імкнуліся пры складаньні плянаў севазвароту па с.-г. сэктары падсунуць нам узоры хутарскіх кулацкіх гаспадарак замест таго, каб паказаць севазвароты ў саўгасах і калгасах. У аддзеле жывёлагадоўлі быў нуны ўхіл на буйную індывідуальную кулацкую гаспадарку.

Выставачнаму камітэту прышлося скласьці спэцыяльную камісію і каранным чынам пераглядзець увесь план с.-г. сэктару, выпраўляючы яго ў адзнаку веднасьці з агульнай устаноўкай на разьвіцьцё калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Апрача гэтага СНК была дана спэцыяльная дырэктыва, каб выстаўка добра адбіла ўплыў індустрыялізацыі краіны на сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, выстаўка на [illegible] ў максымальным разьмеры адлюстраць працесы агрэмаджаньня сельскай гаспадаркі.

Згодна дагавору з ВСНГ Белдзяржбуд павінен праводзіць будаўніцтва павільёнаў выстаўкі ў па-зачарговым парадку. Ня гледзячы на гэта, будаўнічыя работы вядуцца вельмі марудна. Асабліва каменнага двухпавярховага будынку для машына-спробнай станцыі, ёсьць пагроза, што да маразоў яно ўдасца скончыць.

Пабудова іншых павільёнаў выстаўкі таксама затрымліваецца з-за спазьнення з лесаматар'яламі і цэглай. Тэрыторыя выстаўкі амаль што поўнасьцю падрыхтавана пад севазвароты саўгаспкалгаства і агародніцтва. Застаецца пакуль што нявыкананым насаджэньне дрэў і ўпрыгожаньне тэрыторыі выстаўкі.

ВСНГ да апошняга часу не праводзіў плянаў арганізацыі павільёнаў прамысловасьці і, наогул, прымаў слабы ўдзел у падрыхтоўцы выстаўкі. Наркамзем і навукова-дасьледчы інстытут таксама не аддаюць выстаўцы належнай увагі.

Падрыхтоўчая работа да выстаўкі патрабуе ад нас вялікай напружанасьці, мабілізацыі ўсіх сіл нашай рэспублікі. Не гаворачы аб прыцягненьні спэцыялістых і прафэсуры да выстаўкі, **трэба гэту справу паставіць так, каб ня было ніводнага рабочага, бедняка і серадняка-селяніна, які-б ня ведаў аб выстаўцы і не рыхтаваўся да яе.**

Трэба зараз-жа правесьці рад дакладаў аб выстаўцы на пленумах гарсаветаў, сходах прафсаюзных арганізацый, пленумах райвыканкомаў і сельсаветаў, наладзіць інфармацыю аб выстаўцы ў дамах селяніна, а таксама праз хаты-чытальні і нарданы.

Навукова-дасьледчы інстытут усю сваю работу па сэктары сельскай гаспадаркі **павінен перанесьці на выстаўку.**

Кепска стаіць справа з падрыхтоўкай экспанатаў для выстаўкі. Тут нічога ня робіцца ні ў цэнтры, ні па акругах. Акрамя складаньня плянаў працаўнікамі Наркамзему і ВСНГ амаль нічога ня зроблена. Спазьніўся з гэтай справай і сам Галоўвыстаўком.

Час, што застаўся да вясны, трэба скарыстаць для збору і выстаўкі экспанатаў на выстаўку і правядзеньня ўсіх арганізацыйных мерапрыемстваў з такім разьлікам, каб раньняй вясной шырока разгарнуць работу на [illegible] цы.

А. ДУБІНА.

ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б

АБ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЬЦІ

Даклад т. Сташэўскага

У справе ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнае законнасьці мы маем цэлы рад выразных і ясных дырэктыў партыйных зьездаў, канфэрэнцый і пленумаў ЦКК. Гэтыя дырэктывы ўскладаюць на судова-сьледчыя і пракуратурскія органы вялікую адказнасьць па выкананьні іх. Вельмі шкодным і небясьпечным зьявішчам у справе ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнай законнасьці зьяўляецца фармалізм, які наглядаецца ў асобных судовых органах.

ПЫТАНЬНЕ АБ КАДРАХ — ГАЛОЎНЕЙШАЯ ЗАДАЧА

Таму пытаньне падбору працаўнікоў судова-сьледчага складу зараз стаіць так востра, як ніколі. Суд ёсьць орган пралетарскае дыктатуры. Ён павінен служыць выключна інтарэсам дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнаму будаўніцтву.

Суд у сваёй дзейнасьці павінен выходзіць з задач сацыялістычнага наступленьня.

Тав. Ленін аб судзе гаворыць: «Надо не бояться суда (суд у нас пролетарский) и гласности, а тащить волокиту на суд гласности, только так мы эту болезнь всерьез вылечим». Органы юстыцыі разам з іншымі органамі павінны весьці рашучую барацьбу з капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі, дапамагаць узмацненьню сацыялістычнага сэктару нашае гаспадаркі. Таму патрэбна будзе ва што-б там ні стала ў бліжэйшы час уліць у судова-сьледчыя органы **новыя кадры рабочых эд варштату і жанчын.**

Адным з хваравітых нашых зьявішч трэба лічыць **нездавальняючы сацыяльны склад** органаў юстыцыі. У складзе органаў юстыцыі мы маем рабочых: — нарсудзьдзяў 24,3 проц., судовых выканаўцаў — 21 проц., пракураў — 26,6 проц., а сьледчых — толькі 5,5 проц. і абаронцаў — 7,5 проц. Больш-менш здавальняючай зьяўляецца колькасьць рабочых у акруговых судох — 42 проц.

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ЦЯГАНІНАЙ

Да гэтага часу ў судох ня зьнішчана цяганіна і ёсьць рад спраў, якія цягнуцца гадамі. Некалькі прыкладаў: справа па іску Федчанка да Судзілоўскага аб звароце каня (Чырвонапольскі раён, Магілёўшчына) пачалася ў сакавіку 1922 году і скончана толькі ў маі 1929 году ў Вярхоўным судзе. Па справе за цяганіну прыцягнуты да адказнасьці вучастковы памі пракурора і нарсудзьдзя. Або другі абуражучы факт цяганіны, калі Магілёўскае аддзяленьне Дзяржбанку атрымала даручэньне нямецкага дзяржбанку зрабіць выплату грошай аднаму грамадзяніну. На працягу 8 месяцаў аддзяленьне, ня гледзячы на рад напамінаньняў, нічога не адказвала і толькі праз 9 месяцаў напісала ў Вэрлін, каб ім прысылалі даручэньне на расійскай мове, бо ў іх няма супрацоўніка, які-б ведаў нямецкую мову.

САМАКРЫТЫКА ДАПАМАГЛА ВЫЯВІЦЬ ЗЛАЧЫНСТВЫ

У сувязі з разгорнутай самакрытыкай, з ростам актыўнасьці мас, якім асьвятленьнем у друку недахватаў апарату мы маем павялічэньне выкрыцьця службовых злачынстваў у значнай колькасьці. У сувязі з наступленьнем на кулака ў вёсцы і нэпмана ў горадзе, апошнія імкнуцца падпараджаваць свайму ўплыву дзяржаўныя і каапэрацыйныя органы.

Зьявішч растраты далей нельга цярпець. Колькасьць спраў аб растратах значна зьнізілася, аднак, гэта яшчэ не гаворыць, што небясьпека зьменшылася. З разгляданых судамі спраў аб растратах відаць, што ва ўстановах дрэнна пастаўлен грашовы кантроль і зьвярнута слабая ўвага на падбор скарбнікаў. Найбольш характэрнай справай зьяўляецца справа галоўнага бухгальтара Магілёўскага акрэса Габілевіча, які растраціў 30.000 руб. на працягу некалькіх гадоў. Між тым у гэты-ж час у гэтага бухгальтара фінкантроль некалькі раз рабіў рэвізію.

РАШУЧЫ АДПОР ВЫЛАЗКАМ КЛЯСАВАГА ВОРАГА

У сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы пры нашым сацыялістычным наступленьні мы мелі актыўнае супраціўленьне кулацтва, якое выявілася ў забойстве асобных савецкіх грамадзкіх працаўнікоў, у зрыве сходаў, падпале калгасаў і інш. Аб узросьце гэтых спраў сьведчаць лічбы: за ўвесь 1928 год паступіла ў суд спраў аб контр-рэвалюцыйных злачынствах — 81, а за першую палову 1929 году паступілі 72 справы. Трэба сказаць, што мы наглядалі з боку некаторых сьледчых працаўнікоў недапушчальную палітычную недаацэнку гэтых спраў.

СУД, ЯКІ «ГЛЯДЗІЦЬ НА АСОБЫ»

Тав. Вінаградаў падае рад прыкладаў, кія матар'яльныя ўмовы нашых судоў, ных судовых органаў замазаць справы тых або іншых судовых працаўнікоў. Напрыклад, справа Шалімава была спынена судом. Аб п'янстве і растраце судовых грошай групай працаўнікоў Менскага акрсуду было вядома частцы працаўнікоў Наркамюсту, аднак, і гэта справа была незаконна спынена. У выпадках, калі самакрытыка выкрывала падобныя «справы», гэта сустракалася судовымі працаўнікамі ў штыкі. Працаўнікі юстыцыі часамі ўхвалялі пастановы, якія давалі фальшывае ўяўленьне аб «аўтарытэце суду». А ў сапраўднасьці пад гэтым хавалася жаданьне ўтаіць ад мас ненармальнасьці ў судовых органах. Часамі гэта рабілася пры садзейнічаньні парторганаў. Як інакш тлумачыць такі выпадак, як ня крытыкай, «гледзячы на асобы», дырэктыву выданую ў мінулым годзе Менскай АКК аб тым, каб не аддаваць пад суд былога начальніка аддзяленьня міліцыі Сукеніка, які абвінавачваўся ў крымінальшчыне. Або ўзяць справу Рыцікава, у Полацку ён нарабіў шмат шкоды, але потым «узнагароджаны» ён пераводзіцца ў Мазыр у якасьці пам. пракурора. Мы маем рад выпадкаў такой «ссылкі». Наконт самакрытыкі, у нас знаходзіцца нават такія глушыцелі ў судовым апараце, якія, награжаючы крымінальным кодэксам, крычаць, што кодэкс карае за крытыку і самакрытыку. Мы наглядаем, што калі па якім-небудзь бюракратычным выпадку прыцягваюць да адказнасьці адказнага працаўніка, то ўзьнімаецца шум.

Мы павінны цьвёрда сказаць, што аўтарытэт суду і дырэктывы партыі аб барацьбе з бюракратызмам стаіць вышэй аўтарытэту адказнага працаўніка.

ПАБОЛЬШ РАБОЧЫХ У СУДОВА-СЬЛЕДЧЫМ АПАРАЦЕ

Усё гэта даводзіць, што многія зьвяны юстыцыі ня толькі не змагаюцца з бюракратызмам, але самі ня зьвязаны з масамі. Яшчэ ў 1927 годзе мы заняліся чысткай органаў юстыцыі. І зараз перад намі паўстае пытаньне аб самай «зьверскай» і рашучай чысткі судова-сьледчага апарату. Гэта не азначае, што мы павінны ў другіх мясцох паслабіць чысткі, але гэта значыць, што тут мы павінны асабліва ўважліва пачысьціць і абнавіць апарат.

У нашым судова-сьледчым апараце,—заканчвае тав. Вінаградаў, — ёсьць такая вялікая колькасьць недахопаў, асабліва па лініі бюракратызму, на якіх трэба асабліва завастрыць увагу і па якіх трэба біць, ня гледзячы на асобы і ня гледзячы на труднасьці, якіх ніхто не адмаўляе.

***

Па дакладах т. т. **Сташэўскага і Вінаградава** выступілі ў спрэчках наступныя т. т.: **Зяньковіч** (Полацак), **Клічнін** (Магілёў), **Лазоўскі** (ЦКК), **Цынік** (Віцебск), **Гершман** (ЦКК), **Лейкіна** (Гомель), **Волькенштэйн** (Полацак), **Валасэвіч** (Вярхоўны суд), **Эпштэйн** (газэта «Рабочий»), **Сакалоўскі** (БВА), **Хамякоў** (ЦКК), **Дубровін** (Магілёў), **Фінкес** (Бабруйск), **Міхайлаў** (Пракуратура), **Земнін** (Гомель), **Дамброўскі** (Мен. АКК), **Глезэраў** (Пракуратура), **Рыскін** (ЦКК).

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АК КП(б)Б

За бальшавіцкае выхаваньне зьмены

Кожны камсамолец—шчыры удзельнік сацбудаўніцтва і актыўны барацьбіт за генэральную лінію партыі

Узмацніць партыйнае кіраўніцтва камсамолам

ДАКЛАД МЕНСКАГА АК ЛКСМБ

Пленум заслухаў даклад сакратара Менскага АК ЛКСМБ т. **Папянкова** аб становішчы і задачах акруговай камсамольскай арганізацыі. Дакладчык адзначыў, што ўся работа Менскай арганізацыі ЛКСМБ з часу апошняй акруговай канфэрэнцыі праходзіла ў надзвычайна трудных і складаных умовах. Менская арганізацыя ў асноўным правільна ўсьвядоміла тыя задачы, якія стаяць перад камсамолам на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва і паход за ўраджай і калектывізацыю, разгорнутыя па ініцыятыве камсамолу, служаць лепшымі паказальнікамі тэй магутнай актыўнасьці і ініцыятывы, якія ёсьць у камсамольскіх радох. Камсамол актыўна ўдзельнічае ў правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній і барацьбе з адхіленьнямі ад лініі партыі. Але ў асобных выпадках камсамольцы ня толькі не даюць рашучага адпору права-апартуністычнай ідэалёгіі,

Самакрытыкаваць вопыт калектывізацыі Клімавіцкага раёну

Перанесьці яго ў другія раёны Беларусі

Калгасны рух у нас на Беларусі, як па ўсім Савецкім Саюзе, з кожным днём становіцца ўсё больш і больш магутным і ў сапраўднасьці набывае, а ў радзе раёнаў Беларусі ўжо набыў нябывалы масавы характар.

У вялікай будоўлі новай сацыялістычнай вёскі бяруць удзел ужо дзесяткі тысяч асноўных бядняцка-серадняцкіх мас пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый.

Дырэктывы XVI Усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі і дырэктывы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні масавай калектывізацыі, якія аб'яднаюць цэлыя вёскі, валасьці сельскія саветы і раёны, знайшлі ўжо практычнае ажыцьцяўленьне ў радзе месц БССР. Мы ўжо маем не адзін раён на Беларусі, дзе абагулены сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі перавышае вызначаныя заданьні па пяцігадовым пляне, дзе гэтыя заданьні выканаены за адзін год. **З найбольш перадавых раёнаў, якія ідуць упарадзе ўсіх іншых, трэба вылучыць Клімавіцкі раён, Магілеўскае акругі, дзе ўжо калектывізавана звыш 18 проц. усёй зямельнай плошчы; Сьмілавіцкі раён, Менскае акругі — каля 15 проц., Лоеўскі раён, Гомельскае акругі — 13 проц. і рад іншых.** Работа па калектывізацыі набывае такі ўжо размах, што калектывізуюцца цэлыя сельскія саветы. **Даманавіцкі сельскі савет, Мазырскае акругі, дзе налічваецца 1.134 гаспадаркі, усе хутарскія, з плошчай у 11.000 гэктараў, поўнасьцю калектывізаваны. Першы ў БССР калектывізаваны цалкам сельскі савет Даманавіцкі.**

АД ЧАГО ЗАЛЕЖАЦЬ ПОСЬПЕХІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Асабліва каштоўны для нас той лепшы вопыт і мэтады працы, якія выпрацоўваюцца ў практычнай рабоце на мясцох, якія забясьпечваюць найбольш хуткае разгортваньне працы па калектывізацыі, мы павінны ўсямерна распаўсюджваць, перанасіць у працу другіх арганізацый.

Арганізацыя буйных калгасаў у нас на Беларусі пачалася з Клімавіцкага раёну на Магілеўшчыне. Па разьмерах арганізаваных калектыўных гаспадарак гэты раён пакуль што самы найвялікшы. **Толькі за адзін бягучы год па раёне арганізавана каля 15 новых гаспадарак, сярод якіх з плошчай 500 гэкт. 5 калгасаў, ад 500 да 1.000 гэкт.—4 і звыш — 1.000—6, у тым ліку калгасы з 4.000 гэктараў, 2.000 і 1.500.**

Чым можна тлумачыць такія вышкі працы? Варочаючыся з Клімавіцкага раёну, дзе мне давялося пазнаёміцца з працай, у Воршы, на станцыі, я сустрэў аднаго сакратара райкому Аршанскае акругі, у гутарцы з якім ён мне заўважыў, што «ў Клімавіцкім раёне асабліва спрыяючыя ўмовы для калектывізацыі, добрая глеба і г. д., а ў нас пяскі, таму мы ня можам мець такіх посьпехаў». Такія думкі і разважаньні не ў яго аднаго, а ва многіх таварышоў, што працуюць у вёсцы, якія посьпехі калектывізацыі ставяць у залежнасьць ад якасьці глебы і г. д. Зразумела, што ўмовы ня ўсюды аднолькавыя, там, дзе многа куляцтва, працу праводзіць цяжэй, але дзе куляцтва няма? Ёсьць яно і ў Клімавіцкім раёне і ня мала яго там.

Рашаючым зьяўляюцца ня ўмовы, а праца партыйнае арганізацыі. Правільна зразумець і ажыцьцявіць дырэктыву партыі — вось што рашаючае, вось што забясьпечыла посьпех калектывізацыі ў Клімавіцкім раёне.

КАЛГАСЫ ТРЭБА АРГАНІЗОЎВАЦЬ

З паездкі па раёнах Магілеўшчыны, з тых матар'ялаў, якія ёсьць у вясковым аддзеле ЦК відаць, што ў шмат якіх мясцох калгасы не арганізоўваюць, а яны самі «арганізоўваюцца», часамі стыхійна, без належнага кіраўніцтва, без належнага ўплыву і дапамогі з боку партыйных арганізацый. Можна было-б падаць ня мала фактаў, **аб тым, што шмат у якіх раёнах кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам далей агульных гутарак не пашло, ёсьць раёны, дзе на працягу году ў канкрэтнай форме пытаньне калгаснага будаўніцтва ні разу не стаяла ні на раённым партыйным сходзе, ні на пленуме РК КП(б)Б.**

Зусім другі малюнак, зусім другое становішча мы маем у Клімавіцкім раёне. Вось некалькі фактаў: **праведзена на працягу паўтара года 5 нарад сакратароў ячэек, некалькі нарад партыйнага актыву, 3 разы пленум РК абмяркоўваў пытаньне калгаснага будаўніцтва і дзесяць раз — бюро раённага камітэту,** прычым пытаньні не агульнага характару, а зусім канкрэтныя, выразныя. **У выніку ў Клімавіцкім раёне калгасы ў сапраўднасьці арганізуюць, а ня самі яны арганізуюцца.**

МЭТАДЫ РАБОТЫ КЛІМАВІЦКАГА РК КП(б)Б

Клімавіцкі райком КП(б)Б, правільна зразумеўшы задачу масавай калектывізацыі, стала і сыстэматычна праводзіць курс на аб'яднаньне ў калгасы цэлых вёсак; не чакаючы пакуль прыедуць самі сяляне і папросяць, каб у іх арганізавалі калгас, райком вылучае таго ці іншага члена партыі і даручае паехаць у тую ці іншую вёску і арганізаваць калгас. Таварыш, атрымаўшы заданьне, накіроўваецца і пачынае праводзіць там працу, арганізоўвае беспартыйны батрацка-бядняцка-серадняцкі актыў, праводзіць работу сярод беднаты, сярод жанчын і моладзі і, нарэшце, калі глеба ўжо падрыхтавана, ёсьць-паўны сьпіс жадаючых арганізаваць калгас, скліканецца агульны сход, дзе ставіцца пытаньне аб арганізацыі калгасу і тут-жа праводзіцца запіс жадаючых. Пасьля таго, як папярэдняя праца праводзіцца не адзін дзень, а тыдзень, два або і тры, амаль ня было выпадкаў, каб ня быў арганізаваны калгас, і трэба заўважыць, што пры такой працы наглядаюцца рэдкія выпадкі «нехацімпаў», як іх самі сяляне прозвалі, нежадаючых ісьці ў калгас. Напрыклад, у такім буйным калгасе, як «Камунар Магілеўшчыны», які аб'яднае 9 вёсак, «нехацімцаў» толькі каля 18 гаспадарак.

Сярод Клімавіцкага партыйнага актыву сапраўды праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую працу па арганізацыі калгасаў. Німа, бадай, ніводнага таварыша з партыйнага актыву, які на працягу гэтага году не арганізаваў бы і не аформіў па некалькі калгасаў. У атрыманым сёньня ад члена райкому КП(б)Б т. Партнова лісьцо, ён піша, што «толькі сёньня вярнуўся з раёну, выконваў даручэньне райкому. Даручэньне выканаў — арганізаваў калгас, які аб'яднае 100 гаспадарак. Працаваў два тыдні».

Між іншым, ініцыятарам такога мэтаду выезду для сталай працы зьяўляецца сакратар райкому т. Соскін, ён першы паказаў прыклад, як трэба арганізоўваць калгасы, прасядзеўшы таксама каля тыдню ў дзьвёх вёсках, з якіх арганізаваны калгас «Ленінскі Шлях».

Сыстэматычнай упартай працай вёска за вёскай руйнуе межы, расчышчае глебу, стварае ўмовы для сапраўднага ўздыму сельскае гаспадаркі і разьвіцьця вытворчых сіл вёскі праз буйную калгасную гаспадарку.

ЯК ЖЫВУЦЬ НОВЫЯ КАЛГАСЫ І Ў ЧЫМ КАРЫСНЫ МЭТАД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЦЭЛЫХ ВЁСАК

Масавая калектывізацыя апрача падтрыманьня ад пралетарскае дзяржавы патрабуе вялікіх укладаньняў грашовых сродкаў. Прычым, калі сродкі ўкладаюцца на набыцьцё сродкаў вытворчасьці, яны прыносяць, зразумела, больш хуткі эфэкт у параўнаньні з тымі ўкладаньнямі, якія робяцца ў мёртвы капітал, галоўным чынам у жыльля будынкі.

Пры арганізацыі калгасу, шляхам выдзелу в вёскі, зараз-жа патрабуецца крэдыт на набыцьцё і ўзмацненьне сродкаў вытворчасьці і на розныя будынкі, галоўным чынам на жылыя, прычым сумы, што ўкладаюцца ў будынкі, складаюць мясцамі 60-70 проц. усіх атрымлываных крэдытаў. Пры калектывізацыі цэлых вёсак пытаньне аб жылых будынках, прынамсі на працягу бліжэйшых некалькіх год так востра, як пры перасяленьні, не стаіць, а ўсе крэдыты, якія атрымліваюць калгасы, укладаюцца ў сродкі вытворчасьці і гаспадарчыя будынкі. Карысна для калгасу і патрабуецца менш укладаньняў з боку дзяржавы, а гэта мае надта і надта вялікае значэньне.

З усёй сілай і энэргіяй трэба ўзяцца за калектывізацыю цэлых вёсак. Гэта дасьць найбольш хуткі гаспадарчы эфэкт для калгасьнікаў і для дзяржавы.

Аб карыснасьці для саміх калгасьнікаў аб'яднацца ў калгасы цэлымі вёскамі, можна было-б прывесьці ня мала прыкладаў. Возьмем хаця-б для прыкладу калгас **«Ленінскі Шлях»**, першы буйны калгас на Беларусі ў 2.000 гэкт., які арганізаваўся ў красавіку месяцы г. г.

Гаспадарка досыць грунтоўна ўжо замацавалася і за першы год свайго існаваньня дасягнула ня мала гаспадарчых эфэктаў. Яравое поле было апрацавана калектыўна, дзякуючы таму, што апрацоўка была лепшая, чым гэта рабілася пры індывідуальнай гаспадарцы, было ўложана штучнае ўгнаеньне, якога раней ніхто з сялян гэтых дзьвюх вёсак і ў вочы ня бачыў, ураджай атрымаўся такі, што ні адзін стары дзед і ня памятае, каб калі быў такі ўраджай.

Было абагулена жыта, засеянае ў мінулым годзе індывідуальна ў палосках, уборка якога праводзілася калектыўна. Абагулена жывёла. Для гаспадарчых патрэб, з прычыны адсутнасьці ящчэ гаспадарчых будынкаў, часова скарыстоўваюцца лепшыя пуні і гумны, жывуць усе ў сваіх хаціньках, дзякуючы чаму, замест таго, каб займацца пераносам хат, яны заняліся пабудовай цагельні, пабудавалі вапельную печ, рыхтуюць свой будаўнічы матар'ял для будаўніцтва гаспадарчых будынкаў. Выпрацавана ўжо каля 50,000 штук цэглы, падрыхтавана вапна і г. д.

Гаспадарка завяла ўжо добрых сьвіней, сваіх вытворцаў, рад сельска-гаспадарчых машын, праўда, апошнія ящчэ надта мала для такой буйной гаспадаркі, але эфэкт ужо ёсьць: калгасьнікі ўжо адчуваюць, што яны мацнеюць, пачынаюць жыць лепш, чым яны жылі раней. Усё гэта надае ім бадзёрасьці, сілы і ўпэўненасьці ў дасягненьці пастаўленых перад сабой задач. Старая вёска — хаткі, пуні і інш., а ўнутраны зьмест, унутранае жыцьцё ўжо зусім другое, вёска неяк крыху ўпрыгожылася, крыху перамянілася, няма ўжо платоў, якія раней ланцужкамі былі працягнуты ад кожнай хаты да гумна, усё гэта стала ўжо непатрэбным, аджылым.

***

У які-б калгас вы не заехалі, вы ўсюды будзеце зьяўляцца сьведкамі таго бадзёрага настрою, які панае сярод калгасьнікаў, тэй творчай энэргіі, якая накіравана на будаўніцтва новай сацыялістычнай вёскі. Учарайшая вёска, сёньнешні калгас, — гэта дзьве непараўнальныя рэчы. Ня гледзячы на добрыя настроі бядняцка-серадняцкіх мас у вёсцы, калгасныя масы гэта ўжо зусім другая маса, зусім іншыя цікавяць яе пытаньні. Іншыя запатрабаваньні і г. д. Калгасы шпарка пераапрацоўваюць ідэалёгію учарайшага індывідуальнага «самастойнага» гаспадара. Масавы калгасны рух высоўвае з гушчаў бядняцка-серадняцкіх мас здольных арганізатараў, кіраўнікоў і старанных барацьбітоў за новую культурную сацыялістычную вёску. Вось т. **Сілкін**, член савету калгасу «Камунар Магілеўшчыны», зьяўляецца загадчыкам гаспадаркі ў 4.000 гэктараў. Энэргічны, працавіты гадоў 45, гатоў прагутарыць з вамі ўсю ноч, каб высьветліць усе пытаньні, што яго цікавяць, каб даведацца, ці можна зрабіць так, «каб наш калгас быў у сапраўднасьці калгасам, каб ён быў падобны да гораду, каб у нас была электрычнасьць, каб была сямігодка, дзіцячыя ясьлі» і г. д. «Я не гавару ўжо пра добры ўраджай, пра добра пастаўленую гаспадарку, усё гэта ў нас будзе, бо дзеля гэтага мы і пашлі ў калгас, але вось я хачу даведацца, ці дапаможа нам савецкая ўлада, каб ажыцьцявіць вось тое, пра што я вам казаў». Такіх Сілкіных ужо ня мала, усе яны працуюць над тым, каб дапамагчы пралетарыяту хутчэй перабудаваць вёску, хутчэй ліквідаваць «ідыётызм вясковага жыцьця».

АРГАНІЗУЕМ СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ РАЁНАМІ

Мы шмат маем добрых прыкладаў у калгасным будаўніцтве. Шмат цікавых узораў працы партыйных арганізацый і савецкіх органаў. Такія прыклады ёсьць ужо ня толькі ў Клімавіцкім раёне, але Клімавіцкі раён на сёньнешні дзень, ня гледзячы на недахопы ў працы, а яны ёсьць, усё-ж ідзе на перадзе іншых раёнаў. Трэба як мага шырэй выкарыстаць вопыт працы і мэтады, якія ўжываюцца ў гэтым раёне. Трэба шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі на лепшае правядзеньне працы па калектывізацыі.

Аб недахопах у калгасным будаўніцтве, аб рабоце савецкіх, кааперацыйных і іншых органаў у другі раз.

С. МІЦЬКОЎ.

Арганізуем прафвучобу

Набліжаецца зімовая вучоба, а прафорганы чыгуначнага транспарту на гэта пытаньне ящчэ не зьвярнулі належнае ўвагі. А трэба ведаць, што часу ўжо засталося зусім мала.

Паводле вестак, што ёсьць у белбюро ЦК чыгуначнікаў, у мінулым годзе ў Гомелі былі арганізаваны два гурткі (29 чал.), у Воршы—таксама 2 (36 чал.), ў Жлобіне—4 (29 чал.), у Карасьцені—2, у Менску—3, ва Ўнечы—5 гурткоў. У некаторых мясцох мельні перашкаджала працы адсутнасьць памяшканьня, у выніку чаго заняткі гурткоў прыходзілася пераносіць з месца на месца. Не хапала падручнікаў. Ня былі своячасова распрацаваны праграмы. Бязумоўна, што гэта моцна адбілася на пасьпяховасьці працы гурткоў, на якасьці іх работы.

У бягучым годзе трэба своячасова прапрацаваць пытаньні арганізацыйнага і інш. парадку. Трэба зараз-жа распрацаваць сетку адчытаньня прафкол і гурткоў. Своячасова выслаць на месцы праграмы, уключыўшы ў іх агульнаасьветныя дысцыпліны, дысцыпліны па тэхнічных галінах прамысловасьці і інш. Трэба ўключыць у праграмы палітшкол і гурткоў прафгадзіны. У праграмы прафгурткоў трэба ўключыць прапрацоўку пытаньня аб пяцігадовым пляне будаўніцтва на транспарце, а таксама пастановы VIII зьезду прафсаюзаў і інш.

ЗЛОТНІКАЎ.

Чыстка ячэек МЦРК

Праверачная камісія ў складзе т.т. **Скаўронэка, Зінава і Розмана** прыступае з 9-га кастрычніка да праверкі і чысткі ячэек КП(б)Б МЦРК.

Парадак праверкі: **ячэйка № 1** (раён абслугоўваньня—Ракаўская, Ніжні Рынак, Камунальная, Татарская, Пыроская, Пярэсна і інш.)—правяраецца ў клюбе харчавікоў (Школьная вул.) з 9-га па 12-га кастрычніка ўключна. Пачатак праверкі штодзенна а 7-й гадзіне ўвечары.

Ячэйка № 2 (раён абслугоўваньня — частка Савецкай, Маскоўская, Нова-Маскоўская, Юбілейная плошча, Каломенская вул. і інш.) правяраецца ў клюбе імя Леніна (былы чырвоная заля) з 13-га па 18-га кастрычніка ўключна. Пачатак праверкі штодзенна а 6-й гадзіне ўвечары.

Ячэйка № 3 (раён абслугоўваньня — частка Савецкай, Камароўка, Серабрянка, Кастрычнікаваи і інш.) правяраецца ў клюбе саўгандальслужачых з 19-га па 24-га кастрычніка. Пачатак праверкі а 6-й гадзіне ўвечары.

Ячэйка № 4 (раён абслугоўваньня — Ленінская, пляц Волі, Казьма-Дзямьянаўская, Школьная) — правяраецца ў клюбе саўгандальслужачых з 25-га па 29-га кастрычніка. Пачатак праверкі а 7 гадзіне ўвечары.

Ячэйка № 5 (апарат і цэнтральны склад МЦРК)—правяраецца ў клюбе саўгандальслужачых з 30-га кастрычніка па 5-га лістапада. Пачатак а 6-й гадзіне ўвечары.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў КП(б)Б ячэйкі МЦРК, а таксама прымацаваных рабочых хлебазаводу абавязкова.

Запрашаюцца прыняць актыўны ўдзел у чыстцы ўсіх ячэек беспартыйныя працаўнікі прылаўку магазынаў, складаў, супрацаўнікі апарату і пайшчыкі гор. Менску.

Прыём пісьмовых заяў дэжурнымі членамі праверкому штодзенна ад 1-е да 4-е гадзіны ў памяшканьні МЦРК (Савецкая, 43, пакой № 15). Таксама заявы можна апускаць у скрынкі пры гурткомах і магазынах.

Праверачная камісія.

Цяжка адвыкаць

УсеЦСПС і ЦСПСБ далі ўказаньні аб рашучым пераломе ў працы прафсаюзаў. Спэцыяльна для прафсаюзаў Беларусі дадзены ўказаньні, у сувязі з дакладам ЦСПСБ на прэзыдыуме УсеЦСПС. Прафсаюзы—бліжэй да вытворчасьці; прафсаюзы ў цэхі, майстэрні, у гушчу рабочых; за зьмену папярэдняга кіраўніцтва сапраўдным жыцьцём,—вось асноўныя моманты, наўкол якіх прафсаюзы павінны разгарнуць работу.

Факты-ж сьведчаць аб тым, што асобныя прафарганізацыі хаця і прагаласавалі абедзьвума рукамі за новы курс, а на справе вядуць работу па-старому.

ПОЛАЦКІЯ СПЭЦЫ НА РЭЗАЛЮЦЫІ

Горача абгаварылі на пленуме Полацкага акрпрафбюро культработу прафсаюзаў. У спрэчках выказалася шмат прафактывістых. Апрацавалі рэзалюцыю. На чатырох старонках дадзены дырэктывы па ўсіх галінах культпрацы. Каля 20 разоў паўтараецца: «зьвярнуць увагу», «зьвярнуць максымум увагі», «паставіць у цэнтр увагі» і г. д. Забыліся толькі паказаць, хто канкрэтна павінен выконваць іх рэзалюцыю, у якія тэрміны павінны выконвацца гэтыя пункты і хто нясе адказнасьць за іх выкананьне. А таму, усе «увагі» Полацкіх «майстроў рэзалюцый» засталіся мёртвай паперкай.

ЧЫСТКУ ПРАВАЛІЛІ

У прэзыдыуме Аршанскага акрпрафбюро абмеркавалі ўдзел прафсаюзаў у чыстцы савецкага апарату. Выявілася шмат недахопаў, якія і запісаны ў рэзалюцыі. З рэзалюцыі відаць, што Аршанскія арганізацыі несваячасова і няўважліва падышлі да падрыхтоўкі вылучэнцаў з рабочых і батракоў, у выніку чаго саюз будаўнікоў намецёў у вылучэнцы былога гандляра, што на сходах чысткі апарату рабочыя і батракі зусім пасьўна сабе трымалі, што прафсаюзы слаба разгарнулі рабочую самакрытыку зьнізу і інш. Кожнаму ясна, што прафсаюзы Аршаншчыны правалілі работу па чысткі савецкага апарату. Але ўсё-ж Аршанскае АПБ лічыць неабходным у першым пункце запісаць, што «прафарганізацыі Аршаншчыны ў асноўным разгарнулі работу для стварэньня грамадзкай думкі працоўных навакол чысткі савецкага і гандлёвага апарату і ўцягнулі ў практычную работу рабочых».

МАГІЛЕЎСКІЯ ПРАФСАЮЗЫ ПАМЯНЯЛІСЯ РОЛЯМІ З ГАСПАДАРНІКАМІ

Па дакладзе начальніка цягі ст. Магілеў у рэзалюцыі Магілеўскага акрпрафбюро адзначана, што праца вытворчых нарад—дрэнная, што вылучэньне працоходзіць бяз удзелу рабочых мас, што сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі групамі рабочых праходзіць дрэнна, рабочыя беларусізуюцца слаба, што нагладзюцца рвацкія тэндэнцыя з боку асобных брыгад і інш. І выходзіць, што зьнішчыць усе паказаныя недахопы павінны гаспадарнікі, адміністрацыя. Можна падумаць, што Магілеўская АПБ па дакладзе мясцкому адзначыць, што апошні дрэнна забясьпечвае вытворчасьць сырцом і г. д. Адным словам, своеасаблівая «зьмена вех».

***

Вывад з усяго гэтага ясны. Паказаныя факты сьведчаць аб тым, што сапраўдная пералому ў працы некаторых прафарганізацый ящчэ няма. Яго ящчэ трэба дабівацца і праводзіць сіламі ўсяго прафактыву пад узмоцненым кіраўніцтвам партарганізацыі.

Я. СІРОЦКІ.

УВЕСЬ ЛІШНІ ХЛЕБ СПАГНАЦЬ У КУЛАКА ДА 1-га ЛІСТАПАДА

ПЛЯН ХЛЕБАЗАГАТОВАК ПРАСУНУЦЬ ДА КОЖНАЙ ВЁСКІ, ДА КОЖНАГА КУЛАЦКАГА І ЗАМОЖНАГА ДВАРА

Усе сілы, усю энэргію мабілізуем на выкананьне кастрычнікавага пляну хлебазагатовак

НІЯКІХ ПАБЛАЖАК КУЛАКУ!

На барацьбу з нядбайнасьцямі хлебазагатоўчага апарату

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта)

Верасьнёўскі плян ня выкананы

Верасьнёўскі плян хлебазагатовак па акрузе сарваны. Месячнае заданьне выканана **толькі на 36 процантаў.** Брагінскі, Хойніцкі і Камарынскі раёны ящчэ да гэтага часу не распачалі работы па хлебазагатоўках і плятуцца ў хвасьце. Камарынскі раён выканаў толькі 0,4 процантаў месячнага заданьня, а Хойніцкі раён, жытніца акругі, загатовіў толькі 28 процантаў пляну. Толькі Рэчыцкі, Чачэрскі і Гомельскі раёны выканалі свае плянавыя заданьні.

Памольны збор спаганяецца надзвычайна слаба. Квартальны плян выкананы толькі на 63,95 процантаў. У гэтай рабоце таксама адстаюць Камарынскі і Брагінскі раёны, якія спаганялі за тры месяцы толькі 36 процантаў заданьня.

Выключна ганебна спаганяецца закантрактаванае збожжа. Верасьнёўскі плян выканан толькі **на 15 проц.**

Сельсаветы адносяцца прымірэнча да заможнікаў

У чым прычыны невыкананьня пляну хлебазагатовак.

Асноўная прычына — бязьдзейнасьць загатоўчага апарату. У большасьці раёнаў акругі пляны хлебазагатовак ящчэ не даведзены да сяла, ня створаны камісіі дапамогі хлебазагатоўкам. **Наглядаюцца прымірэнчыя адносіны часткі загатоўшчыкаў і сельсаветаў да заможных гаспадарак.** Так, да гэтага часу толькі беднага і лепшая частка сераднякоў выконваюць хлебазагатоўкі, а кулакі ящчэ **ня здалі ніводнага фунту.** Між тым, ні ў адным раёне ня было адзначана ніводнага выпадку опісі маемасьці ў кулакоў за адмаўленьне ад здачы хлебных лішкаў.

Кантралёры здачынна адносяца да сваіх абавязкаў. У выніку млынары ўсяляк **ухіляюцца ад здачы хлебных фунтаў.** Толькі ў Буда-Кашалёўскім раёне заданьне выканана з нераразумэньнем на 36 проц.

У некаторых раёнах кантралёры прадастаўлены сваім сабе. Саюзхлеб слаба імі кіруе і не рэагуе на слабы тэмп спагнаньня памольнага збору.

Сельгаскаапэрацыя, якая абавязана загатовіць хлеб на рынках і спагнаць закантрактаваны хлеб, ящчэ не распачала сваёй работы. Мясцовыя працаўнікі ня хочуць сварыцца з мясцовым насельніцтвам і чакаюць прыезду работнікаў з акругі.

Месцачковы і гарадзкі рынак у руках прыватніка

Сельгаскаапэрацыйныя працаўнікі не пакланаціліся аб тым, каб своячасова ўдарыць па злосных нядзатчыках закантрактаваных прадуктаў. У выніку гэтага, многія кантрактанты вывозяць свой хлеб на рынак і прадаюць яго па павышаных цэнах, а сельгаскаапэрацыі яны аддаюць назад узятыя раней сумы.

Гарадзкія і месцачковыя рынкі знаходзяцца ў руках прыватнікаў-спэкулянтаў. Саюзхлеб чакае самацёку і не загатаўляе хлеба.

Прыватнік, адчуваючы сябе манапалістым на рынку, дыктуе свае цэны. Прычым, ён у гэтым годзе хітра праводзіць сваю работу. Праз знаёмага селяніна-кулака ён скупляе на рынку ўвесь хлеб і перапраўляе яго ў іншыя раёны. **Да рэчы, адміністрацыйны і фінансавы апарат нічога ня робіць для барацьбы са шкоднікамі хлебазагатовак. Чакаюць абежніка вышэйшага органу...** Праявіць сваю ініцыятыву не здагадаліся.

Прафсаюзы і камсамол стаяць з боку

Масавая работа на хлебазагатоўках топчацца на адным месцы. Увага батрацтва і вясковага актыву ящчэ не мабілізавана, як сьлед, вакол хлебазагатовак. Таму ва многіх вёсках **вясковы актыў ящчэ ня здаў сваіх хлебных лішкаў і гэтым самым не стварае неабходных настрояў сярод сялянства.**

Прафсаюзныя арганізацыі ў гэтай кампаніі пакуль што ящчэ стаяць з боку. Саюзамі сельгасрабочых, саўгандальслужачых, працасьветы, мэдсанпрацы, якія зьяўляюцца асноўнымі саюзамі ў вёсцы, **нічога ня зроблена для ўзмацненьня тэмпу хлебазагатовак.** Нават паасобныя члены саюзу, у якіх ёсьць лішкі хлеба, не здаюць іх каапэрацыі, а імкнуцца рознымі спосабамі сплавіць іх на рынку.

Камсамол ня можа пахваліцца сваім удзелам у гэтай кампаніі. Райвыканкомы з халадком адносяцца да хлебазагатовак. Ні ў адным раёне не наладжан адпаведны кантроль за ходам хлебазагатовак.

Канкурэнцыя паміж загатоўшчыкамі ня зжыта

На сход хлебазагатовак значна ўплывае адсутнасьць прамтавараў на вёсцы. У не каторых мясцох былі выпадкі адсутнасьці ў крамах запалак і іншых недэфіцытных тавараў. **Белкаапсаюз да гэтага часу ня выканаў сваіх плянавых заданьняў па завозе прамтавараў у акругі.** У выніку гэтага ў некаторых раёнах паўтараюцца леташнія выпадкі, калі адна каапэрацыйная арганізацыя адмаўляецца адпускаць дэфіцытныя тавары сялянам, якія здалі свае прадукты другой каапэрацыйнай арганізацыі. У некаторых раёнах гэтыя выпадкі часамі даходзяць да анэкдотаў. Селяніну адмаўляюць прадаць боты таму, **што ён здаў свае сельгаставары сельгаскаапэрацыі.**

Усе гэтыя факты наяўна паказваюць, што ў справе хлебазагатовак патрэбен рашучы пералом.

Акрвыканком цяпер прыняў рад практычных мерапрыемстваў па зьнішчэньні паасобных недахопаў. На кіраўнікоў загатоўчых устаноў **ускладзена пэрсанальная адказнасьць** за выкананьне пляну хлебазагатовак. Раёнам запрапанавана мацней націснуць на кулацкія гаспадаркі, ужываючы да злосных нядзатчыкаў 61 арт. закону. Каб больш пасьпяхова праводзіць хлебазагатоўкі, райвыканкомам запрапанавана разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва па раёнах, вёсках і паасобных гаспадарках.

В. Ш.

Кулацкія падпявалы

Правядзеньне хлебазагатовак характарызуецца абвастрэньнем клясавае барацьбы на вёсцы. Кулакі актыўна выступаюць супроць хлебазагатовак і імкнуцца сарваць усю работу мясцовых органаў і скарыстоўваюць для гэтага ўсе сродкі і магчымасьці. Кулакі ня спыняюцца нават перад зрывам сходаў беднаты і сераднякоў. Работнікі сельсавету часта ня толькі не даюць належнага адпору кулацкім выступленьням, а нават падтрымліваюць іх. Напрыклад, у вёсцы Слабада, Менскае акругі, кулакі сарвалі сход, прысьвечаны хлебазагатоўкам. Ім дапамог у гэтым член сельсавету Далідовіч, кулак, які мае два дамы і каля 10 штук буйное рагатае жывёлы. У Хутарскім сельсавеце, Чэрвеньскага раёну, старшыня сельсавету выступіў супроць зацьвярджэньня лічбаў хлебазагатовак. У Пліскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну, кулакі загадзя падрыхтаваліся да зрыву хлебазагатовак, склікалі свае сходы.

Асобныя камуністыя ня толькі не мабілізавалі беднаты і серадняцтва для адпору кулаком, але наадварот, баранілі іх інтарэсы. Напрыклад, наставнік-камуністы ў Вярхмянскім сельсавеце агітаваў за тое, каб кожны селянін здаваў хлеб у аднолькавай колькасьці. З'агітаваны ім сход прыняў пастанову, каб усе сяляне здалі лішкі ў аднолькавым разьмеры. Партыйная ячэйка прышлося склікаць паўторны сход беднаты і серадняцтва, каб скасаваць кулацкую пастанову.

Для таго, каб сарваць хлебазагатоўкі, кулацтва часта ідзе на такія маньўры, антысавецкую сутнасьць якіх на першы погляд цяжка выкрыць. Кулакі добраахвотна здаюць па некалькі пудоў збожжа і выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва на добраахвотную здачу хлеба беднату і серадняку. Сутнасьць гэтага маньўру зусім відавочная: кулак добраахвотна здае мізэрную колькасьць лішкаў і гэтым прабуе ўхіліцца ад здачы вызначанае яму па законе колькасьці лішкаў. Такія факты не адзінкавыя і патрабуюць узмацненьня клясавае пільнасьці мясцовых арганізацый.

Верасьнёўскі плян ня выкананы

Паводле папярэдніх даных Наркамгандлю ўжо зараз можна сказаць, што верасьнёўскі плян хлебазагатовак на Беларусі ня выкананы. Першы месяц хлебазагатовак паказаў, што загатоўчыя арганізацыі ня ўлічылі асаблівасьцей хлебазагатоўчай кампаніі гэтага году і ў выніку мала падрыхтаваліся да выкананьня хлебазагатоўчага пляну. Калі ў мінулым годзе выкананьне хлебазагатоўчага пляну разьмяркоўвалася на цэлы год, то сёлета яго трэба ваканаць за паўгода. Хлебазагатоўчыя арганізацыі ня ўлічылі гэтага, не забясьпечылі сябе належнай колькасьцю памяшканьняў для прыёмкі і сэсыпкі хлеба, тарай і г. д. На мясцох як у дзяржаўных, так і ў прыватных млынох накапляюцца тысячы пудоў збожжа, ня гледзячы на пэўную дырэктыву аб тым, каб ня трымаць больш за 25 пуд.

Слаба ідзе паступленьне хлеба ад калгасаў. Ёсьць выпадкі, калі калгасы прадаюць хлеб на прыватны рынак. Спэкулянты гандляры, якія дэзарганізуюць рынак, не атрымліваюць належнага адпору ад мясцовае ўлады. **У радзе мясцовасьцяй да гэтага часу ня вызначаны пэўныя тэрміны здачы хлеба для кулакоў. У некаторых раёнах Менскай, Гомельскай і Магілеўскай округ пляны хлебазагатовак ящчэ не даведзены да вёскі.** Кантрольныя лічбы хлебазагатовак у шмат якіх мясцох разьмяркоўваюцца сельсаветамі роўна паміж усім селянствам без клясавага падыходу і ўліку лішкаў заможных гаспадарак.

Хлебазагатоўчы плян павінен быць выкананы да 1-га студзеня. **Гэта прымушае значна фарсаваць тэмп хлебазагатовак і павялічвае заданьне на кастрычнік месяц, які зьяўляецца рашаючым у рабоце хлебазагатоўчых арганізацый.**

Для кіраўніцтва ходам хлебазагатовак на месцы ў акругі выехаў рад адказных працаўнікоў. Памылкі і скажэньні, дапушчаныя ў акругах і раёнах, зараз павінны быць выпраўлены. Для кулацкіх гаспадарак павінны быць вызначаны пэўныя тэрміны здачы лішкаў. **Сельсаветам даны правы ўжываць адміністрацыйныя спагнаньні да злосных нядзатчыкаў хлеба.**

Памылкі і недахопы ў Беларусізацыі на Гомельшчыне

Выло-б вялікай памылкай сказаць, што за тры гады з моманту далучэньня Гомельшчыны да БССР мы ня маем ніякіх дасягненьняў у галіне правядзеньня нацыянальнае палітыкі. Мінулыя тры гады даюць нам вялікую колькасьць фактаў, якія сьведчаць аб тым, як з году ў год усё больш і больш пашыраецца наша работа на правядзеньні ў жыцьцё дырэктыў партыі па нацыянальным пытаньні. Грандыёзны размах нашага будаўніцтва, рост сеткі культурна-асьветных устаноў, карэнізацыя апарату, больш сьмелае вылучэньне ў яго рабочых, арганізацыя раду нацыянальных саветаў, школ, тэатраў і г. д.—вось факты, міма якіх нельга прайсьці.

Тры гады работы ва ўмовах БССР, ёсьць лепшы довад правільнасьці далучэньня Гомельшчыны да БССР.

Ня спыняючыся на пералічэньні нашых дасягненьняў, мы хочам падрабязна спыніцца на некаторых галоўных недахопах у беларусізацыі. Няма асаблівай патрэбы пералічваць нашы дасягненьні. Яны ёсьць і іх ня мала. Але пры задачах, якія стаяць перад намі, пры патрэбах, прад'яўленых цяпер нам жыцьцём, яны нездавальняючыя.

Які-ж асноўны недахоп у беларусізацыі на Гомельшчыне. Першае—гэта тэмп. У адносінах тэмпу беларусізацыі ў раду таварышоў няма ящчэ поўнай яснасьці. Мы сустракаемся з настроямі аб тым, што непатрэбна ўзмацняць тэмп, што ёсьць плян, дый наогул навошта сьпяшацца з беларусізацыяй.

Мы лічым неабходным ударыць рашуча па падобных настроях. Трэба проста ставіць пытаньне **аб узмацненьні тэмпу беларусізацыі.** Мы будуем сацыялізм, выкарчоўваем карэньні капіталізму, мы ўзмацняем наша наступленьне на ўсіх франтох. Узмацняць саюз рабочай клясы з масай беднаты і сераднякоў вёскі, узмацняць кіраўнічую ролю пралетарыяту ў гэтым саюзе, мы лепш зможам пры поўным аўладаньні мовай працоўных мас вёскі.

Ударыць трэба ня толькі **па актыўным, але і пасыўным супраціўленьні.** Выпадкаў апошняга мы маем у практыцы нашай работы ня мала. Мы вельмі часта сустракаемся з такімі выпадкамі, калі таварышы галасуюць за беларусізацыю, на ўзмацненьне беларусізацыі, а [illegible] супраціўляюцца. Паколькі падобныя зьявішчы нярэдкія, мы павінны згрупаваць агонь нашае самакрытыкі іменна на іх, як на людзях, вольна ці навольна

Непатрэбны баласт у клініках БДУ

Сярод звышштатных ардынатараў —дзеці гандляроў і нэпманоў

Гуманізм НК аховы здароўя да „звышштатных"

Гуманізм, добрадушша, бяспрэчна добрыя якасьці. Іх не пазбаўлены НК Аховы Здароўя. Аднак, закон дыялектыкі захоўвае сілу і тут: добрадушша, узятае, як кажуць, у «лошадиной» дозе, губіць свае першапачатковыя якасьці і ператвараецца ў абломаўшчыну, у лёльнае нагляданьне яўных непарадкаў.

Пры БДУ існуе рад клінік. Там пад кіраўніцтвам прафэсароў вядзецца падрыхтоўка маладых кадраў дактароў-ардынатараў.

Інстытут ардынатараў складаецца з звышштатных, якіх вылучае НК Аховы Здароўя, і штатных, вылучаных студэнцкімі арганізацыямі.

У адносінах да звышштатных выяўляецца неабмежаваная прыхільнасьць НК Аховы Здароўя.

Трэба памятаць, што кадры звышштатных ардынатараў павінны ў першую чаргу запаўняцца раённымі (вясковымі) дактарамі. Аднак, на справе кадры звышштатных ардынатараў у абсалютнай большасьці запоўнены гарадзкімі дактарамі, сярод якіх много дактароў, якія ня маюць навуковых вдольнасьцяй. Ня лішне дадаць, што вначны процант сярод іх **складае сацыяльна чужы элемэнт: дзеці гандляроў, лесапрамыслоўцаў і інш.** Многія з іх запасаюцца дыплёмамі ардынатараў, арыентуючыся на будучыню: клінічны атэстат высока цэніцца ў мэдычна-навуковых колах.

Адным словам, ня ганьбячы лепшых маладых кадраў клінік, трэба ўсё-ж сказаць, што там набралася шмат гультаёў, якіх можна бяз шкоды для работы вычысьціць. Гэта і было зроблена ў мінулым годзе пад націскам усёй грамадзкасьці Мэдфаку.

Але сёлета амаль усе звышштатныя ардынатары адноўлены на рабоце. Гэтым гуманным актам мы абавязаны... НК Аховы Здароўя, які паслухмяна схіліў свае «вушы» перад абуранымі дырэктарамі клінік, якія не пажадалі парушыць клінічнай сямейнасьці.

Клінікі зноў перапоўнены дактарамі, сярод якіх много «звышштатных» ардынатараў. Яны акуратна прыходзяць у клініку, бегаюць па палатах і габінэтах, дзелянца свежымі навінамі і... перашкаджаюць... Каму? Асноўнаму кадру работнікаў, штатным ардынатарам; студэнтам мэдыкам і падрыхтоўцы маладых кадраў дактароў для вёскі.

Мы чакаем ад НК Аховы Здароўя адказу, ці думае ён і надалей захоўваць свой гуманізм у адносінах да звышштатных.

МЭДЫК.

116 новых спэцыялістых

На выпуску праўгасу БДУ

7-га кастрычніка адбыўся ўрачысты вечар, прысьвечаны першаму выпуску праўгасу БДУ.

Урачыстае пасяджэньне адкрыў тав. **Каранеўскі**, які ў сваёй прамове адзначыў ролю новых спэцыялістых у будаўніцтве сацыялістычнае гаспадаркі.

Прафэсар **Вальфсон** зачытаў сьпіс выпускнікоў. Усяго выпускаецца 59 кваліфікаваных эканамістых і 57 юрыстых.

Выпускнікоў віталі ад акругкому КП(б)Б тав. **Цэнцыпер**, ад Наркамасьветы—тав. **Лысоў**, ад парткалектыву БДУ—тав. **Эпштэйн**, выступалі таксама з прывітаньнямі прадстаўнікі рабочых заводаў «Бальшавік», «Энэргія», ад ВСНГ—тав. **Стракоўскі**, ад НКЮ—тав. **Валасэвіч** і інш.

У адказнай прамове тав. **Леванчук** ад імя выпускнікоў запэўніў, што ўсе новыя спэцыялістыя выканаюць усклаўзеныя на іх партыяй і савецкай уладаю задачы па сацыялістычным будаўніцтве.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б.

Р. С.

Скончылася канфэрэнцыя пралетстуду БДУ

Скончылася канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва БДУ. Канфэрэнцыя прызнала палітычную лінію Наркамасьветы за апошнія гады няправільнай.

НКА нічога не рабіў у справе камплектаваньня БДУ рабочай, батрацкай і бядняцкай моладзьдзю.

Пры прыёме і адначуленьні выключаных з складу БДУ сацыяльна-чужых элемэнтаў меў месца пратэкцыянізм. Усё гэта вяло да пагоршаньня сацыяльнага складу і паслабленьня тэмпу пралетарызацыі студэнцтва.

У радох асьпірантуры і навуковых працаўнікоў назіралася сацыяльна ідэалёгічная засьмечанасьць, а кіраўніцтва з боку Наркамасьветы было недастаткове.

Адсутнічала ўсякая жывая сувязь Наркамасьветы з студэнцтвам.

Дрэнна адбіваўся на акадэмпасьпяховасьці поўны разрыў паміж вышэйшай і ніжэйшай школай, недастаткова разгорнута сетка рабфакаў.

Канфэрэнцыя прызнала патрэбным у самым хуткім часе ажыцьцявіць адзінства сыстэмы індустрыяльна-тэхнічнае асьветы. Пашырыць сетку рабфакаў з адначасовым прыёмам на ўсе курсы. Трэба неадкладна праверыць сацыяльна - ідэалёгічны і экзамінічны склад асьпірантуры і ўкамплектаваць ВНУ выкладчыкамі-марксыстамі.

Лінія работы выканбюро прызнана правільнай.

Апошнім пытаньнем на канфэрэнцыі было абраньне новага складу праўленьня БДУ.

Студэнцтва з свайго боку пастанавіла раіць у склад новага праўленьня наступных т. т.: **Каранеўскага**—старшыня праўленьня і рэктар БДУ, **Рыўліна**—намесьнік па навучальнай частцы, **Хурсіна**—прадстаўнік ад студэнцтва, **Вальфсона**—дэкан праўгасу, **Кроля**—дэкан мэдфаку, **Прыляжаева** — дэкан хэмфаку, **Ісьпенскага**—дэкан пэдфаку і **Гурло**—дэкан рабфаку.

Пералом у рабоце калегіі зямельнага кантролю

Фарсаваным тэмпам праводзіцца калектывізацыя

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР **тав. Зыбкоў** зрабіў даклад аб дзейнасьці Асобнай Калегіі вышэйшага кантролю на зямельных справах.

З дакладу высьвятлілася, што практыка земляўпарадкаваньня, якая праводзілася раней, перашкаджала вытворчаму каапэраваньню і сацыялістычнай перабудове вёскі. Так, напрыклад, на Віцебскай акрузе за пэрыяд з 1922 па 1-е кастрычніка 1928 году было ўпарадкавана 265 тысяч гэктараў плошчы, на якой створана калгасаў—3 проц., пасёлкаў—15,2 проц., хутароў—73,9 проц. і інш. відаў—7,9 проц. Зямельныя справы праходзілі вельмі марудна. Шмат было парушэньняў клясавай лініі і рэвалюцыйнае законнасьці як з боку ніжэйшых земорганаў, так і з боку калегіі зямельнага кантролю старога складу.

Зараз пералом у земляўпарадкаўчай рабоце, калектывізацыя праводзіцца фарсыраваным тэмпам.

Выступаўшыя ў спрэчках члены Прэзыдыуму ЦВК адзначылі, што калегія зямельнага кантролю ня выканала рад дырэктыў Прэзыдыуму ЦВК БССР **—аб узмацненьні асабовага складу земкамісій, пастаноўцы дакладаў зямельных камісій і калегіі зямельнага кантролю на шырокіх агульных сходах рабочых, сялян, чырвонаармейцаў.**

Чыстка Менскай біржы працы

Скончылася чыстка сэкцыі разумовай працы менскай біржы працы. Праверана каля 1.000 чал. Зьнята з вучоту 84 чал. Сярод іх — дачка б. абшарніка, лішэнцы, б. гандляры і г. д. Некаторыя беспрацоўныя зьняты з вучоту за сыстэматычнае адмаўленьне ад працы.

3-я пазыка індустрыялізацыі

Вёска слаба ахоплена пазыкай

Камісіі садзейнічаньня не працуюць

Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне Цэнтральнай камісіі садзейнічаньня рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Заслуханы былі даклады **Аршанскай** акруговай і **Коханаўскай** раённай камісій садзейнічаньня рэалізацыі 3-й пазыкі.

Было адзначана, што пры больш-менш здавальняючым ходзе рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых гораду, рэалізацыя пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях, асабліва сярод сялянства праводзіцца нездавальняюча.

Да апошняга часу раённыя камісіі садзейнічаньня амаль не праводзяць ніякае работы.

Акруговая камісія слаба кіравала работай раённых камісій. У працягу 3-х месяцаў акруговая камісія засядала толькі 3 разы.

Усяго на акрузе афармлена пазыкі на 45 проц. Пры пашырэньні пазыкі на вёсцы мелі месца запалохваньні сялян і прымусовая падпіска.

Каапэрацыйныя арганізацыі ня прымаюць ніякага ўдзелу ў кампаніі па рэалізацыі пазыкі.

Былі выпадкі, калі некаторыя контрагенты выдавалі сялянам замест грошай аблігацыі, якімі сялянства на другі дзень разьлічвалася па страхоўцы і с.-г. падатку.

Выйгрышы па 2-й пазыцы індустрыялізацыі

Брыгада па праверцы выйгрышаў

Пры Беларускай канторы Дзяржбанку ўтворана брыгада з 15 банкаўскіх працаўнікоў для праверкі выйгрышаў 4-га тыражу 2-й пазыкі індустрыялізацыі па аблігацыях, якія былі зданы на захаваньне ў Дзяржбанк. 5-га кастрычніка брыгада праверыла 1.300 аблігацый. Выяўлена 63 выйгрышы на суму 2.300 руб. Ёсьць такія выйгрышы: адзін у 250 р., 7—100 р., 3 — 60 руб., адзін — 50 р., 5—40 р. і 45 выйгрышаў па 20 руб. Учора Беларуская кантора Дзяржбанку пачала выплату выйгрышаў.

На барацьбу з цэмраю

Рэгістрацыя няпісьменных па Менску

У нядзелю, 6 кастрычніка, быў праведзены вучот няпісьменных, малапісьменных і дзяцей школьнага ўзросту ў г. Менску.

Вучот праводзілі студэнты БДУ, палітэхнікуму і 3-х тэхнікумаў. Горад быў падзелены на 25 інструктарскіх вучасткаў. Усяго ў перапісе ўдзельнічала больш 800 чалавек.

Для перапісу быў назначаны трохдзённы тэрмін, але большасьць інструктарскіх вучасткаў выканалі работу на працягу 2-х дзён.

Студэнты праявілі ў рабоце выключную арганізаванасьць і дысцыпліну. Насельніцтва ў большасьці выпадкаў вельмі прыхільна сустракала рэгістратараў. Было шмат выпадкаў, калі няпісьменныя старэй 45 год, якія не падлягаюць вучоту, патрабавалі, каб і іх зарэгістравалі.

Папярэдня вынікі перапісу будуць вядомы праз 2-3 дні.

***

Ад рэдакцыі: **У адным з наступных нумароў будзе зьмешчаны артыкул аб выніках перапісу і задачах паходу.**

Рэдакцыя просіць студэнтаў, пісьменьнікаў і іншых, якія прымалі ўдзел у перапісе няпісьменных і якія маюць цікавыя матар'ялы аб ходзе перапісу, зайсьці ў рэдакцыю ад 12 да 2 гадз. дня да тав. *Бутомава.*

Масавы паход за грамату

6-га кастрычніка студэнцтва Менску наладзіла масавы перапіс няпісьменнага насельніцтва. Увесь горад быў разьбіты на 24 вучасткі. У паходзе ўдзельнічала каля 800 студэнтаў. Гэтымі днямі на агульным сходзе студэнцкіх арганізацый будуць намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па адкрыцьці пунктаў і ахопе імі ўсяго няпісьменнага насельніцтва Менску.

МЕНСК

Назначэньне

Загадчык сельска-гаспадарчай сэкцыі Дзяржпляну БССР. **т. Бонч-Асмалоўскі** аслабанёны СНК ад займаемай пасады. Членам прэзыдыуму Дзяржпляну і загадчыкам сельска-гаспадарчай сэкцыі назначаны **тав. Крывіцкі.**

Тав. Адамовіч А. Т. аслабанёны Прэзыдыумам ЦВК БССР ак абавязкаў намесьніка Народнага Камісара земляробства.

Тав. Сянькевіч назначаны членам нацыянальнай камісіі ЦВК БССР.

Дзень ураджаю і калектывізацыі

СНК БССР намеціў рад мерапрыемстваў па правядзеньні дня ўраджаю і калектывізацыі. На гэту мэту адпускаецца 30 тысяч рублёў. Будуць праведзены раённыя выстаўкі, арганізавана 5 паказальных выставак-перасовак. Спэцыяльна вызначаецца 5 тысяч рублёў на арганізацыю экскурсій сялян на выстаўкі.

Курсы рабочых-вылучэнцаў

У канцы кастрычніка Наркамюст арганізуе курсы вылучэнцаў для работы ў органах Наркамюсту. На курсы будуць прымацца рабочыя і батракі. Тэрмін навучаньня на курсах—8 месяцаў.

27 новых навучальных устаноў

З 1-га кастрычніка ў БССР адкрылася 27 новых навучальных устаноў. Сярод іх — 3 дзённых і вячэрніх рабфакі, рад прафтэхшкол, курсаў і г. д.

Амэрыканскія вучоныя аб Біра-Біджане

Учора ў клюбе Карла Маркса адбыўся мітынг, на якім выступілі з дакладам езьдзіўшыя ў Біра-Біджан амэрыканскія вучоныя. Даклад амэрыканскіх спэцыялістых выклікаў вялікую зацікаўленасьць працоўных Менску. Генэральны сакратар «Ікора» т. Тальмі адзначыў, што вакол пытаньня калёнізацыі Біра-Біджану ў Амэрыцы разгарнуліся шырокія спрэчкі. Рэакцыйная частка яўрэйскай грамадзкасьці выступіла супроць калёнізацыі Біра-Біджану.

У друку зьявіліся артыкулы, у якіх апісвалася, што ў Біра-Біджане круглы год стаіць зіма і няма ніякае магчымасьці распачынаць пляўную працу.

Калі амэрыканская камісія спэцыялістых знаходзілася ў Парыжы і Бэрліне, дык ім там раілі вельмі ўважліва сачыць за тым, каб «савецкая ўлада не паказала ім замест Біра-Біджану Украіны».

Старшыня камісіі прафэсар **Гарыс** у сваім выступленьні заявіў, што Біра-Біджан зьяўляецца вельмі багатай краінай і прыгоднай для разьвіцьця сельскае гаспадаркі і прамысловасьці.

Усе амэрыканскія прафэсары ў сваіх прамовах адзначылі, што Біра-Біджан зьяўляецца цудоўным месцам для калёнізацыі і перад гэтым краем ёсьць вялікая будучыня.

Забесьпячэньне лесазагатовак рабочай сілай

У мінулыя гады на лесазагатоўках прымаліся на працу кулакі, пры найме рабочай сілы панаваў ажыятаж і канкурэнцыя. У бягучым сэзоне забесьпячэньне лесазагатовак рабочай сілай узяў на сябе Наркампрацы. Створаецца спэцыяльны апарат акруговых упаўнаважаных і агэнтаў-вярбоўшчыкаў, якія будуць садзейнічаць сялянскім камітэтам узаемадапамогі пры найме рабочай сіле.

Курс для шоферaў

Гэтымі днямі пачынаецца пабудова будынку для курсаў па падрыхтоўцы шоферaў. Будынак павінен быць скончаны ў лістападзе. Курсы разьлічаны на 50 чалавек. Тэрмін навучаньня—6 месяцаў. Заняткі на курсах распачнуцца каля 15 лістапада.

ЗА ДЗЕНЬ

Перадача працалектываў мясцовай прамысловасьці.—Працалектывы шчотачнікаў, тэкстыльшчыкаў, рымароў і войлачнікаў перададзены мясцовай прамысловасьці. У гэтых калектывах знята каля 1.200 рабочых.

Курсы лясных працаўнікоў. З 1-га лістапада Лесбел адкрывае ў Менску 6-ці месячныя курсы для малодшага тэхнічнага пэрсаналу — расьпілоўшчыкаў, бракераў і лесазагатоўшчыкаў.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

вабсельколраў і рэдкалегій насьценгазэт

праводзіцца ў рэдакцыі газ. «Зьвязда»

штодзенна ад 2-х да 4-х гадз дня, па серадах і пятніцах ад 6-ці да 8 гадзін увечары.

Масавы аддзел газэты «Зьвязда».

2.120 тыс. руб. па пашырэньне працалектываў

Паводле пляну Наркампрацы, у 1928-29 годзе намечана было ўцягнуць у працалектывы 3640 чалавек, на што павінна было быць выдаткавана 1.015 тысяч руб. За 11 месяцаў мінулага гаспадарчага году ўцягнута 3285 чалавек, ці 90,3 проц. заданьня. Недавыкананьне пляну тлумачыцца перадачай раду прадпрыемстваў мясцовай і дзяржаўнай прамысловасьці, у якую згодна пляну трэба было ўцягнуць пэўную колькасьць беспрацоўных.

Ня гледзячы на перадачу мясцовай прамысловасьці 12 прадпрыемстваў—з лікам рабочых у 2.600 чал., саматужнай прамысловасьці 36 прадпрыемстваў—з лікам рабочых у 1.100 чалавек, і дзяржаўнай прамысловасьці 9 прадпрыемстваў—з лікам рабочых 1318 чалавек, у бягучым годзе у працалектывы будзе накіравана на працу да 2.000 чалавек.

Будуць значна пашыраны існуючыя працалектывы, а таксама адкрыты новыя працалектывы. Адкрываюцца працалектывы, дзе будуць рабіцца мэтрычныя меркі, сялянскія вазы, выраблянца чараніца і пашырана керамічная вытворчасьць. Адчыняецца таксама працалектыў па выпрацоўцы з адходаў скуры трансьмісійных пасаў і падошвы.

На ўсе гэтыя мерапрыемствы намечана выдатковаць 2.123 тыс. руб. Частка гэтых грошай будзе адпушчана па дзяржбюджэце, а частка з прыбыткаў саміх прадпрыемстваў.

Першы мастацкі камэрны ансамбль

Не пашкадаваў той, хто пацікавіўся названым ансамблем і паслухаў маскоўскіх музычных гасьцей. Гэты невялічкі калектыў высокай мастацкай якасьці складаецца з пяці домбр (круглых), дзьвюх балалаек і раялю.

Усе інструманты адзначаюцца вельмі прыгожай гучнасьцю і надзвычайна прыемным тэмбрам, а квінтовы (скрыпічны) строй робіць іх непараўнальнымі са звычайнымі балалайкамі і домбрамі.

І вось гэты невялічкі ансамбль здолеў захапіць слухачоў сваёю музыкаю, бо гэта была сапраўдная музыка. Ніводнага таннага эфэкту, ніякіх куншчокаў, усюды паважныя адносіны да мастацтва і музычнага хараства.

Бездакорнасьць ансамблю, на дзіва тонкая і глыбока прадуманая нюансіроўка, нейкая лёгкасьць гучэньня і разам з тым прыгожая пявучнасьць, пачуцьцё меры, што панує над усім выкананьнем—вось галоўныя дадатныя бакі музычнага калектыву.

У першым аддзяленьні канцэрту был, выкананы сьпевы расійскія, украінскія, беларускія («Купаленька» ў апрацоўцы Грэчанінава) і яўрэйскія. У другім аддзяленьні салістыя (Сямёнаў, Міхайлаў і Цуканаў) і ўвесь ансамбль выканаў «Вясковы малюнак» Ільінскага і вальс з балету «Лебядзіная возера» Чайкоўскага. Квартэт (дзьве балалайкі і дзьве домбры) выканаў «Andante cantaabile» з квартэту Чайкоўскага.

У падборы рэпэртуару відаць мастацкае пачуцьцё ансамблю. Ён дае наогул музыку толькі высока мастацкую, а з другога боку не адважваецца на творы, складаныя, якія па сваім характары ці фактуры ня могуць быць належна перададзены такім ансамблем. Вось чаму ў гэтых адносінах я мог-бы зрабіць маленькі дакор артыстым: папершае, вальс Чайкоўскага, хоць і быў выканан са звычайнай ансамблю дасканаласьцю, але згубіў увесь свой «сымфанізм», усе свае аркестровыя фарбы, а падругое andante-kantabile а таксама мала захавала стыль смычковага квартэту, хоць і выканана было даволі пявуча. У першай тэме гэтага твору (народнай) артыстыя чамусьці, як быццам, сьпяшаліся, так што нават групэтто ня зусім удавалася першай балалайцы.

Аднак, гэтыя ляпсусы (калі іх можна назваць ляпсусамі) зусім не парушылі агульнага ўражаньня ад канцэрту.

Ансамбль працуе пад дэвіазам: «музыка масам». Ён цалкам мае права насіць гэты дэвіз, бо яго ігра стаіць на вялікай мастацкай вышыні. Трэба толькі выканаць гэты дэвіз і ў іншых адносінах: трэба ансамблю затрымацца ў Менску на даўжэйшы час і, апрача двух абвенчаных канцэртаў, азнаёміць шырокія рабочыя гушчы са сваім мастацтвам у буйнейшых клюбах. На гэта павінны зьвярнуць увагу пасрэдрабіс і іншыя ўстановы, каму гэта належыць.

Ю. Д.

Загатоўкі махоркі па кантрактацыі

Закантрактавана 75 гэктараў махоркі

У бягучым годзе, па прапанове Махорсындыкату, арганізавана сяўба махоркі і кантрактацыя махорачнай сыравіны. Белсельсаюз, праводзячы кантрактацыю, сустрэў рад перашкод. Акрпляны некаторых акруг зусім не дазвалялі праводзіць кантрактацыі махоркі. Земплян Наркамзему выкрэсьліў махорку з ліку культур, якія падлягаюць кантрактацыі, лічачы, што яна не заслугоўвае ўвагі.

Між тым пашырэньне пасеўнае плошчы махоркі ёсьць пытаньне жыцьця і сьмерці махорачных фабрык БССР. Да апошняга часу фабрыкі вельмі дрэнна забясьпечваліся махорачнай сыравінаю.

Загатоўка ў БССР да 300 тон махоркі па кантрактацыі ўжо здаволіць 20 проц. патрэб менскай і бабруйскай фабрык.

Кантрактацыя махоркі прайшла даволі ўдала. Упяршыню ў БССР закантрактавана 75 гэктараў махоркі. На 1929-30 год намечана закантрактаваць ня менш 300 гэктараў, што дасьць магчымасьць задаволіць патрэбы ў сыравіне 2-х фабрык.

Кантрактацыя ахапіла галоўным чынам саўгасы і калгасы. Амаль што ня было праведзена кантрактацыі ў індывідуальных гаспадарках. У будучым годзе мяркуецца ахапіць кантрактацыяй і індывідуальныя сялянскія гаспадаркі.

К. В.

Што зроблена па лістох рабселькораў

◎ Сям'і чырвонаармейца Гаспадарыка з 1-га лютага **выплачваецца пэнсія** Халопеніцкім РВК пасьля паданьня жонкай Гаспадарыка мэтрычных даведак аб **утрыманцах.**

◎ Белкаапсаюзам прапанавана праўленьню Беларускага спажывецкага т-ва зараз-жа **падабраць належны асартымэнт кніжак** і даць у крамы для продажу па заметцы «Дайце кніжку селяніну».

◎ Зьнят з працы загадчык жыльлёвым сталом Менкамгасу — **Ігнацюк за грубыя і агідныя адносіны да насельніцтва.** Таксама пераселен праф. **Іваноўскі** з будынкаў НДІ.

◎ Аднавіць на працу селькораляськіна Лоўгача ў Азярынскім лясьніцтве, прапанавала Мазырская акруговая РСІ **з выплатай яму за час вымушанага прагулу** за кошт лясьніка **Залімана**, на віне якога быў зьняты з работы Лоўгач. **Матар'ял аб прасьледваньні селькора перадаецца пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.**

—◎ Загадчык Менкамгасу паведамляе, што мост па Першамайскай вуліцы **будзе яшчэ адрамантаваны ў бягуч. годзе.** Агульнае ўпарадкаваньне вуліцы зрабіць у гэтым годзе нельга, з прычыны адсутнасьці сродкаў.

◎ Заказ на творы Леніна адасланы Белдзяржвыдавецтвам 1-X 1929 году Забашэйцкай ячэйцы КП(б)Б. Раней немагчыма было адасласць, бо заказ атрыманы ад Белкаапсаюзу 30-IX 29 г. і **БДВ не нясе адказнасьці за спазьненьне Белкаапсаюзу.**

◎ Зроблены новыя выбары ў Скрыгалаўскім спажывецкім таварыстве. Тав. **Сукененку пастаўлена на від за парушэньне дэмакратыі** па заметцы «Дэмакратыя па Суканенку».

◎ Абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем студэнту Горацкай с.-г. акадэміі, **Мірановічу,** Аршанскай АКК за тое, што **ён перашкаджаў у сваім сельсавеце перавыбарам саветаў у часе канікулаў.**

◎ Мазырскім крымвышукам перадаецца суду па 196 арт. КК былы старшыня Тураўскага РВК — **Родзьвін за цэлы рад злоўжываньняў у часе яго старшынства.**

◎ Выключаны з ліку культурна-ўзорных гаспадарки: гр. Валодзькі Васіля, Кадкі Віктара, Немачай Марыны, Тлобыча Віктара, Пятухоўскага, Дзежыц і Хацько прэзыдыумам Пухавіцкага РВК пасьля абсьледваньня па даручэньні Менакрвыканкому. **Гаспадаркі аказаліся кулацкімі і доўгі час ашуквалі Пухавіцкі РВК.**

◎ Заможніка Макоўскага, каваля арцелі Азярыцкага камітэту ўзаемадапамогі, прапанавана **зьняць з работы** пастановай Мазырскай акруговай РСІ. Адначасова **адзначаны фармальныя адносіны Азярыцкага райкому КП(б)Б да высьвятленьня перагляду даручаных заяў, аб чым перадаецца справа ў АКК.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Клюб навуковых працаўнікоў перайшоў на бесьперапынны тыдзень. Запіс у члены клюбу штодзенна. Перарэгістрацыя старых і запіс новых членаў у гурткі працягнут да 10 кастрычніка. 10 кастрычніка, а 9 г. увечары—агульны сход усіх запісаўшыхся ў гурткі. Пры клюбе — цір. Клюб адчынен з 6 г. увеч.

— **ДОМ КАМАСЬВЕТЫ ІМЯ КАРЛА МАРКСА.** Сёньня—кіно «Месяц зьлева». 3 сэансы: а 6 з палов., 8 і 10 гадз. ув. Каса адчынена ад 6 гадз. увеч.

РЭСП. БЮРО АРУ. Сёньня а 6 гадз. увеч. у памяшканьні АРУ (Савецкая, 65) адбудзецца пасяджэньне бюро АРУ з наступным парадкам дня: 1) Даклад брыгад аб выніках паездкі на раён па абсьледваньні становішча вучоту па хлебазагатоўках і парадку разьлікаў з колгаснымі за здаваемы хлеб, 2) Даклад камісіі па павыш. кваліф. аб стане з новымі курсамі, 3) Даклад камісіі па праверцы ўдзелу членаў АРУ у сацспаборніцтве (Менцшэю, Дзаржгандлю, Белсампрамсаюзу), 4) Аб шэфотве АРУ над калгасамі, 5) бягучыя справы. Запрашаецца актыў АРУ.

— Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні АПА габінэту клюбу Карла Маркса, нарада ўсіх кіраўнікоў груп адзінай партшколы Фрунзаўскага і Кастрычнікавага раёну.

— АПА АК КП(б)Б склікае нараду слухачоў нядзельняга унівэрсытэту мінулага году.

Усе т. т., якія наведвалі ў мінулым годзе нядзельны унівэрсытэт, павінны зьявіцца 16 кастрычніка, а 7 гадз. увечары ў залю пасяджэньняў АК КП(б)Б (3-ці паверх).

— 9 кастрычніка агульна-адукацыйных заняткаў у саўпартшколе на будзе

Ячэйская група 2-га курсу на першыя заняткі павінна зьявіцца ў пятніцу 11 кастрычніка, у 2-ю сямігодку, а 7-й гадзіне ўвечары.

Зьменныя групы саўпартшколы займаюцца ў клюбе камуністычнае асьветы (б. клюб К. Маркса) у раней вызначаныя часы ў сераду.

— Заўтра, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні польклюбу Розы Люксембург (уваход з вул. К. Маркса) адбудзецца пасяджэньне антыкаталіцкае сэкцыі Менакрсавету СВБ.

Членам і кандыдатам бюро сэкцыі т. т.: Кватюўскаму, Клясу, Анджэйку, Корэуну, Сепраўскаму, Мястоўскай, Сьвідэрскай, Сталярскай, Доўгаполаву, Яшкевічу, Жыхараву, Вілунасу, Скардзісу Галавацкай, Заенчкоўскаму і Путніну яўка абавязкова і без спазьненьня.

— У чацьвер 10-Х, а 7-й гадз. увеч. у памяшканьні АК МОПР'у (Савецкая 87) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Мен. АК МОПР.

Парадак дня: 1) Плян работы Мен. АК МОПР і сэкцый.

2) аб сьвяткаваньні 12-ці годз. Кастрычн. Рэвалюцыі;

3) аб кампаніі зімовае дапамогі політзьняволеным;

4) аб арганізацыі курсаў МОПР-актыву.

5) Бягучыя справы.

На пасяджэньне запрашаюцца члены Мен. АК МОПР'у якія знаходзяцца ў Менску, таксама гарадзкі актыў МОПР'у.

Просьба не спазьніцца.

У сераду, 9-Х, а 9-й гадз. увечары, у памяшканьні АК МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца пасяджэньне сэкцыі па шэфоту над палітзьняволенымі.

Павінны зьявіцца наступныя члены сэкцыі: т. т. Ноім, Каган, Бориацкі—(Універсітэт), Каплан—харчав., Бароўнікава—жакт № 1, Памаранец—ЦСПСБ, Кіраўнік—зав. «Бальшавік», Шымановіч — зав. «Дрэваапрацоўшчык», Саламонаў — т-ка п.-нат.

Прозьба не спазьніцца.

— Райпраўленьне шэфтаварыства Кастрычнікавага раёну паведамляе, што у чацьвер 10-га кастрычніка г. г. роўна а 7-й гадз. увеч., у памяшканьні райкому, адбудзецца пленум праўленьня шэфтаварыства. Пасьля пленуму будзе праведзены ў 1-шы раз сэмінары па калектывізацыі.

Прысутнічаньне ўсіх членаў і кандыдатаў праўленьня, старшынь і сакратароў выканбюро і ўсіх т. т., якія працуюць у шэфаддзяленьнях па калектывізацыі абавязкова.

Папраўка

Ва ўчарашнім нумары быў зьмешчаны выклік праўленьня Белсельсаюзу на збор сродкаў на пабудову самалёту «С.-Г. Каапэрацыя БССР». У выкліку прапушчаны прозьвішчы членаў праўленьня, унёсшых 100 руб. Павінны быць: «Члены праўленьня Белсельсаюзу т. т. Дубіна, Тумас і Талапіла ўнесьлі 100 руб. і выклікаюць членаў праўленьня»...

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОУ.

ЦСПСБ СУМЕСНА З ФРУНЗАЎСКІМ РАЙКОМАМ КП(б)Б — СКЛІКАЮЦЬ — на суботу, 12 кастрычніка, а 6 гадз. увеч. у памяшк. клюбу імя К. Маркса

ШЫРОКУЮ РАЁННУЮ РАБОЧУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ

з наступным парадкам дня:

1. Аб выніках мінулага гаспадарчага году, і кантрольныя лічбы на 1929-30 год. (Дакладчык т. КАРКЛІН).
2. Аб пераходзе на бесьперапынны рабочы тыдзень. (Дакладч. т. РОЗІН).

МОДУС ПРАДСТАЎНІЦТВА: ад прадпрыемстваў: 1 дэлегат ад 20 рабочых, ад устаноў—1 ад 50 служачых. Дэлегаты абіраюцца на цэхавых, зьменных і агульных сходах рабочых і служачых.

ВЫДАЧА МАНДАТАЎ будзе праводзіцца ў ПЯТНІЦУ, 11-га кастрычніка, з 9-ці да 4-х гадз. дня і ад 6-ці да 8-мі гадз. увечары ў памяшканьні агульнай канцылярыі ЦСПСБ (Дом Працы, другі паверх, пакой № 4) і ў СУБОТУ, 12-га кастрычніка ад 9-ці да 4-х гадз. дня там-жа і ад 5-ці да пачатку канфэрэнцыі — у клюбе імя Карла Маркса.

МАНДАТЫ ВЫДАЮЦЦА па прад'яўленьні выпісак з пратакол. цэхавых, зьменных і агульных сходаў, завераных ФЗМК.

ЦСПСБ і ФРУНЗАЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б.

УПАЎНАВАЖАНЫЯ ГАЗ. „ЗЬВЯЗДА".

Фрунзаўскі райком КП(б)Б і рэдакцыя газэты «Зьвязда» склікаюць на 10 кастрычніка а 6 з пал. гадзіне ўвечары

нараду ячэйкавых упаўнаважаных „Зьвязды"

з парадкам дня: 1. Аб працы ўпаўнаважаных. 2. Аб спаборніцтве паміж ячэйкамі па падпісцы на «Зьвязду».

Нарада адбудзецца ў памяшканьні АПА Райкому.

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

СКОРА! СКОРА! СТАРОЕ і НОВАЕ

ТЭАТР і КІНО

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Мастацкі баявік вытворч. „Межрабпом-фільм" ГАНДЛЯРЫ СЛАВАЙ — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — кіно-хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО Бабруйскія манэўры. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Французкі сэнсацыйны фільм АПОШНІ ПАЛЁТ (драма пад купалам цырку) Звыш прагр. кіно-хроніка „Совкино" № 44. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары — 2 ФІЛЬМЫ Ў АДЗІН СЭАНС 2. I. СЭРЦА АЗІІ (Афганістан) кіно-нарыс у 6 ч. II. Замежная канэдыя з удзелам папулярнага артыстага ГАРОЛЬД ЛЕЙДА БАЎКІН УНУЧАК. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Цікавы фільм сав. вытворчасьці ГОГІ РАЦІАНІ ў 6 част. Звыш праграмы-кіно-хроніка САЎКІНО, прысьвечаная ўсесаюзнаму зьлёту юных дзеінцаў. Цана білета 10 кап.)—(Месцы нумараваны.

КІНО СпартаК — Ад нанядзелка, 7 кастрычніка ГАСТРОЛІ папулярных рознахарактарных народных дуэтыстых М. Н. Валошынай і І. І. Шапашнікава — На экране сусьветны фільм — ПАТ І ПАТАШОН на МОРЫ. Канэдыя ў 7 част. Пач. 1-га сэанс. а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г. 30 м.

ПАМЯШКАНЬНЕ ЦЫРКУ | СЁНЬНЯ і ШТОДЗЕННА новы мастацкі бытавы фільм | КІНО-ТЭАТР „МЮЗИК-ХОЛЛ"

НЕ ПА ДАРОЗЕ ў 6 част.

Пасьля карціны—эстрадная праграма

2 МІЛАЛК 2 | 3 ГАРМАНІСТЫЯ 3 | сьпявачка С. Н. ПРЫЧЫНСКАЯ

ТОЛЬКІ 2 СЭАНСЫ: у 8 гадз. і ў 10 гадз. увеч.

Білеты ў касе цырку ад 15 кап. да 40 кап.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, хірургічных, жаночых, зубных, вока, кожных, вуха, горла, носа і скуры

ПРЫМАЮЦЬ ПА ПАПЯРЭДНІМ ЗА